Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся — Пролетарии всех стран, соединяйтесь — Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

СУБОТА 11 КРАСАВІКА . № 83 (3171)

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНАДАРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

ШТОДЗ

Алма-Ата, Дечча 87 Гос. Публичн. библ-ка Инвар. № 32 Г. СВ.

ВЫМОВА ЗА НЕПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ КАНТРАКТАЦЫІ

ЗА НЕПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛІЛЬНА САЮЗУ НА ПАСЯДЖЕНЬНІ АД 6-га КРАСАВІКА Г. Г. АБВЯСЬЦІЛА ВЫМОВУ ПРАЎЛЕНЬНЯМ АСЬВЕЙСКАГА, ЧАВУСКАГА І СЕНЬНЕНСКАГА РАЙКААПСАЮЗАЎ.

Тварам да задач другога кварталу

«Затрымаць тэмпы—гэта значыць адстаць. А адстальых б'юць. Але мы ня хочам аказацца біты мі». У гэтых словах правадыра нашай партыі тав. Сталіна вызначан стыль нашай работы ў перадпяцігодкі. Па-ўдарнаму рашаючым годзе пяцігодкі. Па-ўдарнаму наперад хуткімі тэмпамі, ня зніжаць тэмпы, а, наадварот, па-ўзмоцна сілі і магчымасьці іх павышаць, — вось лёзунг, з якім мы ўступілі ў новы гаспадарчы год, вось лёзунг, з якім мы ўступілі ў першы пэрыяд сацыялізму.

Трэці год пяцігодкі не выпадкова атрымаў назву рашаючага году. У гэтым годзе мы павінны завяршыць фундамант сацыялістычнай эканомікі нашай краіны, у гэтым годзе мы калектывізацыяй ня менш як паловы селяніцка - серадняцкіх гаспадарак СССР вырашаем у асноўных і галоўных рысах у карысьць сацыялізму праблему «хто каго» і ў сельскай гаспадарцы. Вось чаму пытаньне аб тэмпах работы ў гэтым годзе набывае вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне. Вось чаму сапраўды зараз тэмпы рашаюць усё.

Магутным разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва адгукнулася работная клясы на гіганцкія пляны сацыялістычнага будаўніцтва, якія на трэці год пяцігодкі высунула наша ленінская партыя. Новы ўздым працоўнага энтузіязму, новыя брыгады ўдарнікаў, новыя батальёны ўдарнікаў сустрэлі трэці год пяцігодкі. І той факт, што лічная колькасьць перадавых фабрык і заводаў ня толькі выканалі, але і перавыканалі пляны першага кварталу бягучага гаспадарчага году, — гэты факт красамоўна сьведчыць аб тым, што пляны нашы былі цалкам рэальныя.

Вось менская швэйная фабрыка «Кастрычнік», якая выканала прамфінплян на 111,6 проц., вось шчотачная фабрыка імя Крупскай, якая ўступіла ў другі квартал з перавыкананым на 6 проц. планам, вось гомельская гарбарня, якая мае ў сваім балянсе 107.7 проц. выкананьня прамфінплану першага кварталу, вось завод «Бальшавік», які выдаўна сьвяткаваў дзесяцігадовы юбілей свайго слаўнага партакалектыву,—ён таксама перавыканаў прамфінплян. У чым-жа сакрэт перамогі гэтых прадпрыемстваў і дзесяткаў іншых фабрык і заводаў, якія з гонарам выканалі баявое заданьне партыі?

«Сакрэт перамогі» у тым, што трох кутнікі гэтых прадпрыемстваў здолелі па сапраўднаму мабілізаваць і арганізаваць рабочыя масы на выкананьне прамфінплану. «Сакрэт перамогі» у тым, што на гэтых прадпрыемствах паверхне бальшавіцкае кіраўніцтва здолела стаць на чале ўздыму работнай актыўнасьці і павесьці масы на барацьбу і перамогі. «Сакрэт перамогі» у тым, што цьвёрдае ажыцьцяўленьне адзіначальля і жорсткае правядзень не гаспадарчага разрахунку ў гэтых прадпрыемствах было ў неабходнай ступені забясьпечана.

Толькі адсутнічаньнем гэтых трох асноўных момантаў можна растлумачыць, тое, што завод «Ударнік» выканаў свой прамфінплян за першы квартал усяго на 44,7 проц., што Гомсельмаш, які павінен забясьпечыць сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі новай тэхнічнай базай, выканаў свой прамфінплян на 52,9 проц. Гэтыя-ж прычыны тлумачаць прарывы на гутах «Пралетарыі» і «Камінтэрн», на запалкавых фабрыках «Вярэціна» і «Полымя рэвалюцыі», на заводах «Энэргія» і «Камунар». Ніякімі спасыланнямі на аб'ектыўныя прычыны нельга апраўдаць той ганебны прарыў, які вызначыўся ў першым квартале ў металёапрацоўчай, цагельнай, шкляной, хімічнай, тэкстыльнай і абутковай прамысловасьцях БССР.

Мы ўжо ўступілі ў другі квартал трэцяга году пяцігодкі. Гэты квартал за служыць атрымаў назву рашаючага кварталу. Ад таго, як будзе выканан прамфінплян гэтага кварталу, ад таго ці ўдасца нам у гэтым квартале пакрыць запазычанасьць па першаму кварталу—ад гэтага залежыць посьпех усяго народна-гаспадарчага плану на 1931 год. Вось чаму неабходна зараз зазастрыць з усёй сілай увагу ўсіх гаспадарнікаў, усіх партыйных арганізацый, усіх старастатаў на фабрыках і заводах, увагу ўсіх гаспадарнікаў на неабходнасьці рашучага павароту ва задач другога кварталу.

Жорсткі гаспадарчы разрахунак павінен быць у гэтым квартале цалкам праведзен, павінен быць даведзен да кожнага рабочага мейца. Трэба памятаць, што калі мы маем прарывы ў шэрагу галін прамысловасьці БССР па колькасных паказчыках, дык прарыў па якасных паказчыках зьяўляецца амаль суцальным. Толькі гаспадарчы разрахунак праведзены да канца можа забясьпечыць нам выкананьне і якасных і колькасных паказчыкаў прамфінплану.

Тыя шкпраўкі, якія зараз унесены ў крэдытную рэформу робяць немагчымай работу без пераводу на гаспадарчы разрахунак усіх нашых прадпрыемстваў. Зараз фінансаваньне будзе цалкам залежыць ад таго, як ідзе выкананьне прамфінплану. Зараз значна ўзьнімаецца адказнасьць кожнага за своячасовае і дабраякаснае выкананьне прамфінплану. Гаспадарчы разрахунак будзе падсьцёгваць, падганяць ня толькі гаспадарнікаў, ня толькі партыйныя ячэйкі на заводах і фабрыках, але і кожнага рабочага ўвасобку.

Але было-б памылковым лічыць, што адна толькі крэдытная рэформа і ўвядзеньне гаспадарчага разрахунку самі па сабе могуць забясьпечыць пасьпяховае выкананьне прамфінплану другога кварталу. Посьпех плянаў другога рашаючага кварталу рашаючага году пяцігодкі ў асноўным залежыць ад таго, наколькі трохкутнікі заводаў і фабрык здолеюць стаць на чале новага ідучага ўздыму працоўнага энтузіязму, новага ўздыму ўдарніцтва і сацспаборніцтва рабочае клясы, залежыць ад таго, наколькі тэмпы работы будуць адпавядаць тэмпам рашаючага году.

Мы ўступілі ў другі квартал з вялікай запазычанасьцю. Мы гэтую запазычанасьць павінны ліквідаваць. Мы гэтую запазычанасьць ліквідуем.

Беспрацоўе, голад і нішчата працоўных мас Польшчы

—такі вынік панаваньня фашысцкай дыктатуры, тэрару і ваенных авантур

Фашысцкая Польшча пад ударам крызісу

Фабрыка за фабрыкай спыняюць работу, тысячы рабочых выкідаюцца на брук

ВАРШАВА, 10. «Работнік» (орган ППС) публікуе катастрафічныя даныя аб экзамічным крызісу ў Польшчы.

«Урадавая статыстыка прамысловасьці,—піша газета,—падае, што ў лютым месяцы па ўсёй краіне толькі ў пераапрацоўчай прамысловасьці было 1.337 закрытых прадпрыемстваў. Ад сьнежня месяца мінулага году да лютага г. г. было закрыта звыш 300 прадпрыемстваў. Як бачома, на працягу лютага і сакавіка лік працуючых фабрык падлягае далейшаму зьменшэньню.

«Па асобных галінах прамысловасьці лік працуючых і закрытых прадпрыемстваў у лютым месяцы прадстаўляецца наступным чынам: у будаўнічай прамысловасьці 216 прадпрыемстваў працуючых, 225 закрытых; у мінеральнай прамысловасьці—818—працуючых, 353—закрытых; у тэкстыльнай прамысловасьці 694—працуючых, 207 — закрытых; у драўлянай прамысловасьці—630—працуючых, 262—закрытых.

У металяпрамысловасьці было закрыта 80 заводаў; у спажывецкай прамысловасьці—88; у швэйнай—50; у скуранай—31; у хэмічнай — 25; у папаровай—13 і г. д.».

Гэтыя даныя ўрадавай статыстыкі бязумоўна значна зьменшаныя, яскравейшым чынам характарызуюць тое катастрафічнае, экзамічнае становішча, якое назіраецца ў фашысцкай Польшчы. 1.337 закрытых прадпрыемстваў, 450000 выкінутых на брук рабочых,—мільёны асуджаны на голад і нішчату—такі вынік панаваньня фашызму ў Польшчы.

***

ВАРШАВА, 10-IV. «Работнік» паведамляе, што хімічная фабрыка Гроздзіск у Гайноўцы спыніла з 1-га гэтага месяцу сваю работу. Некалькі сот рабочых апынуліся на бруку. Рабочым доўга не выплачваецца зарплата. Дапамогі беспрацоўным няма. Ва ўсёй Гайноўцы панує голад.

У капальнях на Сілезіі—ў Новым Бытоме зьвольнена 326 рабочых, у Катовіцах і Чорным Лесе звольнена200 рабочых, у капальні Вольфгонг—150.

Вялікія звальненьні рабочых маюць адбыцца ў капальнях: «Граф Францы шан» і «Вавель», дзе будзе звольнена па папярэдніх даных польскіх газэт 1.150 рабочых у першай капальні і 896—у другой.

Зусім спынілі сваю працу дзве вялікія капальні князя Пшчынскага «Князь» і «Александр II».

У Жыхліне закрыліся дзве цукровыя фабрыкі «Томчын» і «Модэль», а таксама цыгальня «Фаб'яноўка».

У хуткім часе будзе ліквідавана не вялічкая фабрыка земляробскіх машын «Брон - Бовэры».

Беспрацоўныя разьбіваюць магістраты

ВАРШАВА, 10. У Сэдрыцах адбылася бурная дэманстрацыя беспрацоўных. Дэманстранты ў ліку больш 1.000 асоб накіраваліся ў да магістрату з патрабаваньнем хлеба і работы.

Гарадзкі галава—бургамістр на патрабаваньні беспрацоўных прыгразіў выклікам паліцыі і войска.

Галодны натоўп кінуўся ў памяшканьне магістрату.

Паліцыя і войска падасьпеўшыя свае часова з трудом разагналі дэманстрантаў пусьціўшы ў ход зброю.

Некалькі асоб цяжка паранены. Памяшканьне магістрату моцна зруйнавана.

ВЯСНА Ў ПОЛЬШЧЫ.

ПАН ГЕНЭРАЛ: Вітаю першых «ластавак» вясны...

Шалёным тэрорам польскім фашыстам ня ўдасца сьпыніць рэвалюцыйнай хвалі

Рэзалюцыя-пратэст рабочых заводу „Бальшавік" супроць разгулу тэрору на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне

Разгром Беларускага рабоча-сялянскага Клюбу «Змаганьне», разгром ТБШ, каапэратыўнага банку ў Вільні, шматгадовыя катаржныя прысуды над правадырамі «Змаганьня», разгром ППС-Лявіцы і арышт усіх удзельнікаў зьезду ў Лодзі, праваацыйны арышт Б. Тарашкевіча—увесь гэты ланцуг подлых фашысцкіх выпадаў супроць працоўных мас Заходняй Беларусі ня можа ня выклікаць глыбокага пралетарскага абурэньня з боку ўсяго сусьветнага пралетарыяту.

Польскі фашызм, загнаўшы краіну ў гаспадарчы тупік, павялічыўшы армію беспрацоўных і паміраючых з голаду,—шукае выхаду са стварыўшагося крызісу ў вайне супроць Савецкага саюзу.

Для задушэньня ўсяго рэвалюцыйнага руху польскі фашызм кідае ўсіх лепшых сыноў працоўных у турмы.

13 тысяч палітзьняволеных ў Польшчы—гэта нячуваная лічба нават для горшых часоў расійскага царызму.

Усім гэтым польскі фашызм хоча стварыць умовы для нападу на Савецкі саюз.

Мы рабочыя, работніцы і інжынэра-тэхнічны пэрсонал Чырвонаштандарнага скурзаводу «Бальшавік», узьнімаем свой голас пратэсту супроць азьвярэлай расправы польскага фашызму супроць рэвалюцыйнага руху—заяўляем, што ўзмацненьнем сваёй штодзённай барацьбы за выкананьне прамфінплану мы будзем умацняць СССР, бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Мы абавязваемся барацьбой супроць браку, прагулаў, барацьбы за падвышэньне норм і зьніжэньне расцэнак—забясьпечыць канчатковую пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР ужо ў бягучым годзе.

Мы запэўніваем польскі пралетарыят і пралетараў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, што ў іх клясавай барацьбе супроць польскага фашызму яны атрымаюць пралетарскую дапамогу з нашага боку.

Далоў польскі фашызм!

Ход антысавецкай судовай інсцэніроўкі ў Варшаве

Палянскі свае паказаньні цішком чытае па шпаргалцы...

ВАРШАВА, 9-IV. Пасьля чытаньня абвінаваўчага акту суд заслухаў заяву Палянскага, які, ня гледзячы на неаднаразовыя напамінкі старшыні, працягвае цішком чытаць свае паказаньні напісанымі, «апраўдваючыся слабой памяцьцю».

Падсудны прызнае, што ён устанавіў электрычную праводку і што ён зьмясьціў у дымаходнай трубе савецкага пасольства пякельную машыну. Але ўсё гэта было зроблена, нібы ня з мэтай выбуху пасольства, а ў выглядзе «дэманстрацыі» супроць савецкай ўлады для таго, каб давесьці неабходнасьць барацьбы з бальшавізмам. Ён, Палянскі, «хрысьціянін і не жадае рабіць дрэннага».

Паводле слоў Палянскага, ён ужыў ўсе захады для таго, каб давесьці бальшавікам, што ён мог бы ўзарваць пасольства, але «не жадаў гэтага рабіць». Таму Палянскі зрабіў нібы такую праводку, што яна магла быць адразу выкрыта і вынята, і папсаваў электрычна кантакт, які злучаў пякельную машыну з электрычнай праводкай, сканструяваў, нібы, такі ўдарнік у бомбе, каб не маглі атрымацца іскраў; сабраў, нібы, нарэшце няправільна гадзіньнікавы мэханізм і набіў знарад такой выбуховай матэрыяй, якая не магла разарваць яго павалоку. Ужо пры першых пытаньнях пракурора і членаў суда Палянскі безнадзейна заблытваецца. Палянскі ня можа растлумачыць, як ён бяз чыёй небудзь дапамогі аўдаваў на даху, прымацоўваючы электрычныя правалы, устанаўліваючы пякельную машыну. Да рэчы пракурор па гэтым пытаньні не асабліва націскае на палсудныга—пытаньне аб існаваньні супольніцкай арганізацыі, паслаўшы Палянскага на гэту справу, пакуль не цікавіць пракурора.

Пасьля яўнага провалу спробаў Палянскага выкруціцца пры расьсьледваньні фактычнага боку справы Палянскі таксама няўдала спрабуе адыграцца на палітычным. Ён апавядае, што ў СССР яго чакала «бліскучая кар'ера», але гэтай кар'еры перашкодзіла зноў такі—дарэчы яго «хрысталюбіе»: ён не хацеў, бачыце, есьці савецкі хлеб, не жадаючы прыняць на сябе цяжкі крыж. Палянскі апавядае вельмі шмат аб тым, нібы савецкая ўлада шукала яго абвінавачваючы ў «арганізацыі замаху ў Маскоўскім крэмлі» у 1924 г. Пры чым за ўходжаньне яго нібы прызначана ўзнагарода ў 10 тыс. руб.

Палянскі спрабуе затым перайсьці да больш агульных палітычных пытаньняў. «Самым вялікім няшчасьцем для кожнай дзяржавы зьяўляецца, гаворыць ён, цярпець у сваім арганізме савецкае прадстаўніцтва».

Аскандаліўшыся на палітычным экзамене і злоўлены з палічным у тым, што ў расьсьледваньні фактычнага боку справы ён маніў, Палянскі выказвае выключную нядбайнасьць у часе допыту сьведак.

Асноўныя моманты дапросу сьведак заключаюцца ў высьвятленьні раду тэхнічных пытаньняў, якія датычацца ўстанаўленьня пякельнай машыны, гадзіньнікавага мэханізму і электрычных правалоў. Ад гэтых паказаньняў большасьці сьведак разьлятаюцца сьцьвярджаньні Палянскага аб яго «хрысьціянскай афёры» і спробы пралетаріяць свой замах «у нявінную дэманстрацыю супроць бальшавікоў». Усе сьведкі адназгодна сьцьвярджаюць, што пра вал нідзе перарэзаны ня быў.

У паход за зьдзельшчыну

Ніякіх правалочак у пераходзе на зьдзельшчыну!

Недаацэнка ўвядзеньня зьдзельшчыны грае на руку кулаку,—

гэтага не павінен забываць ніводзін камуніст і камсамолец, ніводзін рабочы і калгасьнік

Па-ўдарнаму за ўвядзеньне зьдзельшчыны

ЕЛЬСК (наш кар.). Партыйныя арганізацыі Ельшчыны дзейна ўзяліся за дапамогу ва ўвядзеньні зьдзельшчыны ў калгасах. Бюро райкому КП(б)Б стала прапрацавала пытаньне зьдзельшчыны. У сучасны момант райпартактыў камандыраваны ў калгасы дзе практычна дапамагае калгасам перайсьці на зьдзельшчыну.

Перавод работы калгасаў на зьдзельшчыну будзе ў асноўным скончан да 15-20 красавіка.

Ужо маюцца першыя весткі аб пераходзе на зьдзельшчыну буйнага калгасу «Чырвоная Зара»; прапрацаваны нормы выпрацоўкі па розных галінах гаспадаркі. Разам з гэтым арганізаваны брыгады імя газэты «Савецкая Беларусь», якія сталі на чале новых, правільных мэтадаў арганізацыі працы—зьдзельшчыны.

Райкомам КП(б)Б завострана ўвага на дапамогу ўдарным брыгадам у калгасным будаўніцтве.

Герасіменка.

„Камунар" павінен зараз-жа перайсьці на зьдзельшчыну

Пераход на зьдзельшчыну ў калгасах Лухавіцкага раёну абгаворан на зьезьдзе калгасаў, зьдзе старшынь калгасаў і на пяцідзённай нарадзе калгасьнікаў-арганізатараў працы. На нарадзе падрабязна распрацаваны нормы выпрацоўкі. Нормы і расцэнкі ў працадзнёх разасланы па калгасах, дзе яны апрацоўваюцца на сытворчых нарадах.

Ужо часткова перайшлі на зьдзельшчыну камуна «Зьвязда», калгасы імя Леніна, «Энэргія» і «Чырвоны Кастрычнік».

Не разумее карысьці ад пераходу на зьдзельшчыну калгас «Камунар», які, дарэчы, у выніку сваёй гадавой работы ня мае ніякага прыліву. Зьдзельшчына там не абгаворваецца, яе зусім не жадаюць уводзіць.

Пытаньні арганізацыі працы, зьдзельшчыны, правільнай растаноўкі сіл у калгасах павінны стаць асноўным зьвяном у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Ніводнай хвіліны нельга адкладаць зараз, бо надыходзіць сяўба, да якой ужо трэба быць падрыхтаванымі.

Гарум.

Малады калгас імя Варашылава гатовы да выезду на пасеўны фронт

Калгасьнікі „Новага Жыцьця", прымеце выклік варашылаўцаў!

Калгас імя Варашылава, Коханаўскага раёну, заснаваўся 13 лютага. Ня гледзячы на такі малы час свайго існаваньня, калгас цалкам падрыхтаваўся да выезду на пасеўны фронт.

У калгасе за гэты кароткі час поўнасьцю ачышчана насеньне і створаны насенныя фонды, адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар, патрэбны для веснавой сяўбы, перавезена мінэральнае ўгнаеньне, праведзены сходы сярод насельніцтва аб значэньні веснавой пасеўкампаніі ў сёлетнім—трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, створан запасны фуражны фонд, складзен, абгаворан калгасьнікамі з удзелам адказобнікаў і зацьверджан гадавы вытворчы плян калгасу, набыта ў дадатак да абагуленай 5 шт. буйнай рагатай жывёлы.

Абагуленыя коні ўтрымліваюцца ў добрым дагляДзе.

Уся праца калгасу пабудавана ад першых-жа дзён існаваньня на прынцыпах зьдзельшчыны; праца ўлічваецца па колькасьці і якасьці. Гэта дае магчымасьць правільна растаўіць рабочыя сілы, дамагчыся найбольш прадукцыйнасьці працы і ўжо выклікала прыліў 12 новых гаспадарак у калгас.

Вялікі творчы ўздым сярод калгасьнікаў даў шырокае разгортваньне ўдарніцтва, сацспаборніцтва ў калгасе.

Калгас выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны калгас «Новае Жыцьцё».

Калгасьнікі з уздымам падхапляюць пераход на зьдзельшчыну

Брагінскі райкалгасаюз прапрацаваў пытаньне арганізацыі працы ў калгасах на сваім паседжаньні, а таксама і на нарадзе брыгадзіраў па падрыхтоўцы веснавой пасеўнай кампаніі.

Калгасьнікі з уздымам падхапляюць ініцыятыву пераходу на зьдзельшчыну і з ахвотаю уводзяць новыя мэтады працы. Ужо рад калгасаў раёну перайшоў на нормы выпрацоўкі ў бягучай гаспадарчай рабоце.

Асобныя адгалоскі кулацтва атрымоўваюць рашучы адпор.

Увядзеньне зьдзельшчыны пры цьвёрдых нормах выпрацоўкі і ліквідацыі абязьлічкі дадуць магчымасьць ня толькі выканаць, але і перавыканаць пляны сяўбы.

Шаўчэнка А.

Зьдзельшчына—на задворках

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Увядзеньне зьдзельшчыны ў калгасах Жлобінскага раёну не ў пашане. З агульнай колькасьці 52 калгасаў толькі ў 9 маюцца спробы перайсьці на зьдзельшчыну. Там складзены пляны і нормы выпрацоўкі, але гэтыя пляны яшчэ не прапрацаваны на сходах калгасьнікаў. Па асобных галінах працы нормы яшчэ трэба перапрацаваць.

Пытаньню арганізацыі працы ў калгасах не падаецца належнай увагі ні з боку партыйных ячэек, ні з боку райкалгасаюзу. Дырэктывы, якія даюцца па гэтым пытаньні рабочым камітэтам партыі і РВК, ня выконваюцца.

Такая апартуністычная недаацэнка пераходу на новыя мэтады працы—зьдзельшчыну грае на руку кулаку, які шалёна супраціўляецца нашаму сацыялістычнаму наступу, імкнецца сарваць праграму другой бальшавіцкай вясны, затармазіць новы калгасны прыліў.

Ямс.

„Заняты веснавой пасеўкампаніяй"...

Вельмі дрэнна абстаіць справа з пераводам на зьдзельшчыну калгасаў Крупскага раёну. Работнікі райкалгасаюзу на запытаньне аб зьдзельшчыне даюць адзін адказ: «мы заняты веснавой пасеўнай кампаніяй, зачатоўкамі і інш.». Яны не жадаюць разумець, што зьдзельшчына асноўна ў правільнай арганізацыі працы калгасаў.

Трэба падштурхнуць гэтую работу, каб пасеўкампанія, пра якую так «бла поціца» райкалгасаюз, праходзіла ўжо па прынцыпах зьдзельшчыны.

25-цітысячнік Гурзвіч.

Ачысьціць калгас ад кулакоў

ВОРША. (Наш кар.). Арганізацыя працы ў калгасе імя XVI партэзьзду, Аршанскага раёну, пастаўлена зусім дрэнна. На зьдзельшчыну калгас і ня думае пераходзіць, праўленьне слаба кірує ўсёй работай калгасу. Кулакі, якія пралезьлі ў калгас, імкнуцца папярыць там сваю агітацыю. Яны выступаюць супроць зьдзельшчыны і супроць мабілізацыі сродкаў на набыцьцё машын і іншага сельска-гаспадарчага інвэнтара. Кулацкай агітацыі не дасьць належнага адпору. У выніку гэтага, у калгасе панує ядоцкая сыстэма, працоўная дысцыпліна зусім кульгае. Асобныя калгасьнікі даручанай ім работы ня выконваюць, прагулаў можна занатаваць безьліч.

Камсамольская ячэйка і два кандыдаты партыі, якія знаходзяцца ў калгасе, стаяць у баку ад жыцьця калгасу, з хворымі зьявішчамі яны ніякай барацьбы не вядуць і ня сталі на чале ўпарадкаваньня арганізацыі працы, пераводу яе на зьдзельшчыну, не арганізуюць сацыялістычнае, спаборніцтва і ўдарніцтва.

Калгас павінен неадкладна перайсьці на зьдзельшчыну, на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва і ачысьціць свае рады ад кулакоў. На чале гэтага павінны стаць партыйная і камсамольская ячэйкі. Райкалгасаюз павінен дапамагчы калгасу ў справе пераходу на зьдзельшчыну, увядзеньне якой правільна арганізуе працу.

А. Кудрын.

Не марудзіць з увядзеньнем зьдзельшчыны

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). У Полацкім раёне толькі за апошнія дні пачынае разгортвацца ўвядзеньне зьдзельшчыны. Ня гледзячы на правядзеньне раённых калгасных курсаў па пытаньнях зьдзельшчыны, самі калгасы дастаткова не разварушыліся. Зьдзельшчына пакуль-што ўведзена ў трох калгасах раёну: «Чырвоная Зорка», «Усходы Леніна» і «Перамога». У гэтых калгасах ужо распрацаваны нормы выпрацоўкі, абгаворана і зацьверджана на агульных сходах калгасьнікаў.

Калгасьнікі ўсюды вітаюць гэтае мерапрыемства, адзначаючы, што зьдзельшчына ўзьнімае інтэнсыўнасьць калгаснае працы, дапаможа зьнішчыць гультайства, нядбайнасьць і адыграе вялізарную ролю ў правядзеньні другой бальшавіцкай.

Гэтымі днямі райкалгасаюз выслаў у калгасы 8 работнікаў для непасрэднай работы па ўвядзеньні зьдзельшчыны. Па калгасах праводзяцца сходы, на якіх калгасьнікі абгаворваюць нормы выпрацоўкі і карысьць для калгасу ад увядзеньня зьдзельшчыны ў сэнсе перавыкананьня плянаў калгасных работ.

З мэтаю паўтарэдняга падагульненьня работы па ўвядзеньні зьдзельшчыны, райкалгасаюз склікае раённую нараду старшынь калгасаў. Нарада вызначыць далейшыя мерапрыемствы, зьвязаныя з новымі мэтадамі працы.

Трэба адзначыць, што райкалгасаюз разварушыўся толькі пасьля атрыманьня настойлівых дырэктыў і зараз усё-ж такі ня ўзяў патрэбных тэмпаў у гэтай справе. Частка калгасаў не забясьпечана спэцыялістамі і адпаведнымі інструкцыямі для распрацоўкі норм зьдзельнай працы. У гэтай галіне патрэбна падцягнуцца. Паход за зьдзельшчыну ў калгасах ня церпіць марудзьнасьці.

Баз. Румянец.

Зьнішчыць павольнасьць ва ўвядзеньні зьдзельшчыны

Пачынаючы з лютага месяца г.г. калгас «Вольная Беларусь», Слуцкага раёну парашыў перайсьці на зьдзельную расцэнку працы ва ўсіх галінах гаспадаркі. Былі складзены нормы выпрацоўкі па кожнай галіне работы пасобна і зацьверджаны агульным сходам калгасу.

Аднак, ня гледзячы на пастанову сходу, зьдзельшчына не праводзіцца ў жыцьцё праўленьнем калгасу. Між тым набліжаецца вясновая сяўба, якой нельга пачынаць пры ранейшых мэтадах працы—ядоцкай сыстэме.

Разам з тым калгас яшчэ са студзеня месяца пачаў ліквідацыю абязьлічкі. Ужо тады калгасьнікі і брыгады былі прымацаваны да коняй і іншай жывёлы. Зараз праводзіцца прымацаваньне калгасьнікаў да сельска-гаспадарчага інвэнтара.

Не абмяжоўваючыся часковай ліквідацыяй абязьлічкі калгас павінен правесьці поўнае прымацаваньне калгасьнікаў да ўсяго жывога і мёртвага інвэнтара.

Поруч з гэтым трэба неадкладна ўзяцца за ўвядзеньне ў калгасе зьдзельшчыны, якая значна павялічыць прадукцыйнасьць працы і дасьць правільнае разьмеркаваньне ўраджаю.

Апартуністычная недаацэнка з боку праўленьня калгасу значэньня зьдзельшчыны зрывае падрыхтоўку і пра ведзеньне другой бальшавіцкай вясны.

Калгас павінен выйсьці ў поле правільна арганізаваўшы працу, правільна расставіўшы свае сілы на асновах зьдзельшчыны.

Мазо.

Плян вапнаваньня глебы пад пагрозай зрыву!

Угнаеньне глебы—адно з рашаючых зьвеньняў у барацьбе за ўраджай

Да разводзьдзя засталіся лічаныя дні. Скарыстаць санную дарогу для падвозкі вапны

Хто зрывае ўгнаеньне палеў?

Заданьне партыі і ўраду аб своячасовым забесьпячэньні веснавой сяўбы натрэбнай колькасьцю ўгнаеньня—пад пагрозай зрыву.

Сьцягалы **«Савецкай Беларусі»**, якія былі пададзены яшчэ ў лютым месяцы, не пачуты. Ні Наркамзем, ні Белсалгасцэнтр, ні іншыя ўстановы, якія ведаюць гэтай справай па сур'ёзнаму не адносьліся да пазрэджаньняў друку аб катастрафічным становішчы забесьпячэньня сяўбы мінэральным угнаеньнем. Вакол пытаньня своячасовага забесьпячэньня гаспадарак угнаеньнем ня былі мабілізаваны шырокія масы калгасьнікаў і рабочыя саўгасаў; апарат як у цэнтры так і на месцах не пераключыў сваю работу на баявыя рэйкі.

Адгэтуль, справы забесьпячэньня веснавой сяўбы ўгнаеньнем па ранейшаму знаходзіцца ў катастрафічным становішчы.

Згодна дырэктыў ураду у бягучую вясну па пляну патрэбна **заваншаваць 30.000 га**, перадаць палём **16.000 тон фасфарытнай мукі**; на працягу 1931 **году** правесьці **тарфаваньне глебы на плошчы 40.000 га.** Гэтая важнейшая дырэктыва ўраду выконваецца злачынна марудна.

Сяўба не за гарамі. Аднак, на 1-га красавіка плян кідтрыў і вапны па БССР **выканан толькі на 13,3 проц.** Аналёгічнае-ж станов шча і з завозам растварымых фасфарытаў. Так, па лініі саўгасаў заданьне па гэтым угнаеньні выканана ўсяго на 40 проц., па калгасах на 65 проц.

Гэтыя паказчыкі характарызуюць надзвычайна дрэнне становішча забесьпячэньня веснавой сяўбы вызначанай колькасьцю ўгнаеньня. Хто адказвае за зрыў гэтага мерапрыемства, дабіцца дзяжка, НКЗ—кіўае на Белкалгасцэнтр, Белсельтрэст і іншыя ўстановы. Апошнія ў сваю чаргу кажуць на свае сыстэмы, шукаюць «стрэлачніка». У гэтым перапляценьні, у моры настаноў, абежнікаў, суровых загадаў патанулі 77 тыс. тон вапны.

Дзе знаходзіцца вапна

З 77.000 тон вапны, якая даўно павінна быць ужо у гаспадарках,—47.000 тон вапны знаходзіцца на вапельнях, 18.000 тон раскіданы па складах, на розных станцыях і толькі 12.000 тон дастаўлена ў гаспадаркі. 71 вапельня спынілі работу. Вапельныя заводы завалены вапнай. Плян вапнаваньня глебы ў 1930 годзе сарваны. Апартуністы зрываюць вапнаваньне глебы і ў 1931 г. Вапну ніхто не бярэ. Бюракраты патанулі ў моры папер. Вапнай «займаюцца» усе, пішуць «грунтоўныя» цыркуляры—самастрахуюцца. Дзесьці-нідзьбудь, ва ўстановах працяцца на самастрахоўку; практычнай справай мала займаюцца. Зборам зьвестак, хоць-бы на тэй-жа вапне, займаюцца НКЗ, Белсельтрэст, Белкалгасцэнтр, Паляводсаюз і ўся «усяленная» падпачаленых, але ніхто з іх дакладна ня ведае сапраўднага становішча ў чым прычына таму, што плян па ад трэсцы вапны выканан толькі на 13,3 проц. Адным словам ёсьць тэмпы па частцы самастрахоўкі — няма тэмпаў практычнай работы. **Няма, нарэшце, галоўнага—кантролю выкананьня.** Няма таго—хто павінен адказваць за практычнае выкананьне. Хто павінен сёньня адказаць за тое:

ЧАМУ! У Быхаўскім раёне на складах Райкаапсаюзу яшчэ і сёньня ляжыць 210 тон рознага мінэральнага ўгнаеньня?

ЧАМУ! У Копыльскім раёне ляжыць на складах 127 тон мінэральнага ўгнаеньня?

ЧАМУ! У Дрыбенскім раёне валяецца на складах 110 тон мінэральнага ўгнаеньня і 350 тон вапны?

ЧАМУ! У Рагачове валяецца на складах Райкаапсаюзу 330 тон мінэральнага ўгнаеньня і 1.018 тон вапны? Над канец, ЧАМУ на станцыі Ўза ляжыць на складах 800 тон вапны?

Рад зьвеньнеў як у цэнтры, так і на месцах, на якія ўскладзена гэтая работа, патанулі ў моры бюракратызму. Недацэнка справы ўгнаеньня глебы прывяла да таго, што на сёньнішні дзень плян вапнаваньня пад пагрозай зрыву. «Пляны дадзены мясцом, разважаюць бюракраты, работа зроблена». Як гэтыя пляны выконваюцца—кантроль адсутнічае. На працягу студзеня-лютага і сакавіка справай адгрузкі вапны не займаліся.

„Мы пільна сочым за сводкамі, націскаем"

Калі ў іншых мясцох займаюцца самастрахоўкай, пішуць суровыя загады дык у сэктары прыгарадных гаспадарак Белкаапсаюзу займаюцца ажыўці-рацельствам. Тут панае поўны хаос. Работнікі якія кіруюць гэтай справай, ня толькі ня ведаюць сапраўднага становішча забесьпячэньня прыгарадных гаспадарак угнаеньнем, але ніхто з іх дакладна ня ведае сапраўднага становішча ў чым прычына таму, што плян па ад трэсцы вапны выканан толькі на 13,3 проц. Адным словам ёсьць тэмпы па частцы самастрахоўкі — няма тэмпаў практычнай работы. Няма таго—хто павінен адказваць за практычнае выкананьне. Хто павінен сёньня адказаць за тое:

ЧАМУ! У Быхаўскім раёне на складах Райкаапсаюзу яшчэ і сёньня ляжыць 210 тон рознага мінэральнага ўгнаеньня?

ЧАМУ! У Копыльскім раёне ляжыць на складах 127 тон мінэральнага ўгнаеньня?

ЧАМУ! У Дрыбенскім раёне валяецца на складах 110 тон мінэральнага ўгнаеньня і 350 тон вапны?

ЧАМУ! У Рагачове валяецца на складах Райкаапсаюзу 330 тон мінэральнага ўгнаеньня і 1.018 тон вапны? Над канец, ЧАМУ на станцыі Ўза ляжыць на складах 800 тон вапны?

Рад зьвеньнеў як у цэнтры, так і на месцах, на якія ўскладзена гэтая работа, патанулі ў моры бюракратызму. Недацэнка справы ўгнаеньня глебы прывяла да таго, што на сёньнішні дзень плян вапнаваньня пад пагрозай зрыву. «Пляны дадзены мясцом, разважаюць бюракраты, работа зроблена». Як гэтыя пляны выконваюцца—кантроль адсутнічае. На працягу студзеня-лютага і сакавіка справай адгрузкі вапны не займаліся.

„Ціхі сабатаж", апартунізм ці шкодніцтва?

Два сэктары Наркамзема, ў асобе двух «работнікаў», торф мэйстэра Кобызева і інспэктара па мінэральным угнаеньні Кесарава, сарвалі плян тарфаваньня глебы на БССР. Яшчэ 3-га сьнежня 1930 году СНК БССР у сваёй пастанове аб падрыхтоўцы да сяўбы прапанаваў. **«Правесьці тарфаваньне глебы ў 1931 годзе на плошчы 40.000 га, у тым ліку—у савецкіх гаспадарках 5.000 га, у калгасах—25-га і ў вытворчых таварыствах—10.000 га, і забясьпечыць загатоўку торфавага ўгнаеньня і торфавай падсьцілкі для плошчы 1932 году ў 60.000 га».**

Плянам Наркамзема прадугледжана ў веснавую сяўбу затарфаваць 30 проц. усёй вызначанай плошчы. Але... чамусьці паміж сэктарам паляводзтва і сэктарам торфараспрацовак пачалася «распря»—пачаліся опрэчкі аб тым, хто павінен займацца справай тарфаваньня глебы. Гэтая барацьба адбываецца ўсю зіму, ня спынена яшчэ і зараз. Справай тарфаваньня ніхто не займаецца. Становішча з торфам сарвана.

«Наша функцыя—тэхнічны нагляд, ізыканьне торфу, распрацоўка плянаў, праэктаў—заяўляе тарфмэйстэр **Кобызеў**—прыкладчыцкая-ж работа ня гэтым пытаньні павінен праводзіць сэктар паляводзтва».

«Гэта не мая функцыя,—заяўляе інспэктар па мінэральным угнаеньні сэктару паляводзтва, **Кесараў**».

— Выходзіць, што справай тарфаваньня ў БССР ніхто не займаецца?—пытаемся Кесарава.

— На маю думку **тут у** апараце Наркамзема **маецца ціхі сабатаж—нарэшце** прызнаецца **Кесараў**. Справу тарфаваньня я віду «нелегальна». Віду таму, што яе проста закінулі; але зьвестак у мяне ніяких няма, як гэтая справа праводзіцца на мясцох. немаю дома. Трэба адкрыта сказаць, што НКЗ на сёньнішні дзень тарфаваньнем глебы не займаецца.

Так стаіць справа з выкананьнем пастановы ўраду па пытаньні тарфаваньня глебы. Гэты факт—ганебная пляма, якая ў першую чаргу кладзецца на калегію Наркамзема. Характарна яшчэ і тое, што паасобныя члены калегіі Наркамзема ведаючы аб такім становішчы з тарфаваньнем не рэагавалі на лежным чынам. Больш таго, гэтая справа яшчэ і да гэтага часу застаецца беспрытульнай.

Гэты факт апартуністычнай сьлепаты павінен быць выведзен на чыстую ваду.

Такія адносіны да справы тарфаваньня глебы невыпадковы. Мы маем факт больш ганебнага зьместу. У Грэскім раёне адзін з прадстаўнікоў мелізаема разглядаючы плян Райза прызнаў, што вызначаная раёнам пад тарфаваньне плошча ў 177 га нерэальна і прапанаваў аграному Магілеўскаму скараціць плян. І толькі на ўпартасьць Магілеўскага, які не згадзіўся, плян ня быў скарочаны.

* * *

Мы падалі тут частку тых абуральных фактаў у справе выкананьня пляну веснавой сяўбы ў частцы забесьпячэньня яе ўгнаеньнем. Сыгналы друку аб зрыве пляну забесьпячэньня ўгнаеньнем засталіся пустым гукам. Зруху пакуль няма. Больш таго, справа з угнаеньнем стаіць пад пагрозай зрыву. Патрэбны самыя рашучыя меры. Патрэбен жорсткі кантроль выкананьня пастаноў партыі і ўраду. Трэба прымусіць займацца справай, а ня путаркамі аб угнаеньні. Досыць разважаньняў. Патрэбна сапраўды ўдарная работа. Пляны веснавой сяўбы павінны быць выкананы. Трэба з каранём выкарчаваць апартуністычную практыку. Мінэральнае ўгнаеньне не павінна валяцца на складах, яно павінна быць на палёх саўгасаў і калгасаў.

М. КАШЭВІЦКІ.

Вываз вапны на палі—неадкладная задача

Паводле пляну СНК БССР па 85 раёнах БССР прапанавана заваншаваць увесну 31 г. 30 тысяч га. Ход вывазкі вапны калгасамі прымушае бяць трывогу за выкананьне гэтага пляну. Калі ў бліжэйшыя дні ня будуць прыняты энэргічныя меры па арганізацыі вывазкі вапны на палі дык плян вапнаваньня будзе сарваны.

Паводле даных Наркамзему БССР на 1-га красавіка калгасамі вывезена вапны,—12 проц. пляну. Ад раду раёнаў зусім няма ніякіх весткі як праводзіцца ў іх гэта работа.

Нездавальняючы ход вывазу вапны тлумачыцца тым, што ў радзе раёнаў проста ідабайна адносяцца да гэтага важнейшага мерапрыемства.

Ня ўсе калгасы яшчэ належным чынам ацанілі вапну, як ўродак угнаеньня. У радзе выпадкаў, заяўляюць, «якая карысьць ад каменя», хоць ніводным прыкладам, з сваёй практыкі не пацьвярджаюць сваё мяркаваньне ў сілу вапны. У **Грэскім раёне**, сярод калгасьнікаў распаўсюджана думка, што вапна шкодзіць ураджаю, ня маючы ніякіх падстаў для такіх выводаў.

Ня толькі калгасьнікі, але і аграномы, мала знаёмыя з вынікамі вопытных станцый па вапнаваньні, з халадком адносяцца да ўжываньня вапны на ўгнаеньне.

У Бабруйскім раёне, ні ў каапсаюзе, ні ў Райза, ні ў Райкалгассаюзе ня ведаюць колькі вапны вывезена калгасамі на сёньнішні дзень. Гэта паказвае, што яны ня кіруюць справай вывазу вапны, а спадзяюцца на самацёк, «а мо калгасы вывезуць».

Трэба цьвёрда сказаць, што грамадзкая думка не мабілізавана вакол гэтай справы. Раённы друк не разгарнуў кампанію за вапнаваньне глебы, за арганізацыю вывазу вапны на палі.

У Грэскім раёне маецца гатовай молатай вапны 750 тон. Але да 15 сакавіка калгасамі і саўгасамі не забрана ніводнай тоны. Толькі ў выніку ўмяшаньня РСІ ўдалося арганізаваць вываз вапны і да 1-га красавіка ўжо вывезена вапны ў колькасьці 22 проц. пляну. Але і тут не абышлося без галавацяпства.

Да веснавога разводзьдзя засталіся лічаныя дні. **Гэтыя дні трэба скарыстаць для вывазу вапны на саннай дарозе на калгасныя палі.** Трэба мабілізаваць усе сілы на выкананьне пляну вапнаваньня. Вапнаваньне як адно з пытаньняў агратэхнікі дапаможа хутчэйшаму росту і замацаваньню калгасаў.

І. Афанасьеў.

Замест жывога кіраўніцтва—дождж паперак

Полацкія райарганізацыі не разгарнулі паходу за падняцьце ўраджайнасьці

Да выезду ў поле засталіся лічаныя дэкады. Гатоўнасьць да выезду ў поле заключаецца ня толькі ў адрамантаваньні с.-г. інвэнтара і стварэньня насенных фондаў, але таксама і ў належнай падрыхтаванасьці да выкананьня аграмінімуму.

Як-жа абстаіць справа з барацьбой за падвышэньне ўраджайнасьці на Полаччыне?

У мінулым годзе, бяручы сярэднюю лічбу, засеяны па калгаснай зямлі, дзякуючы добрай апрацоўцы і угнаеньня, даў ураджай на 15 проц. вышэй, чым та пасеву у аднаасобнай гаспадарцы. Сёлета патрэбна дабіцца яшчэ большай эфэктыўнасьці калектыўнае працы. Між тым ня зусім добра пасоўваецца наперад забясьпячэньне калгасаў угнаеньнямі. Попелу па калгасах сабрана 45 цэнт., што зьяўляецца зусім нездавальняючым.

Пры гэтым яшчэ трэба прыняць пад увагу папырэньне плошчы калгасамі на 1308 га за кошт раскарчовак і занятага пагару. Угнаеньня патрабуецца нават большая колькасьць, чым гэта вызначана ў пляне.

Апранамічная дапамога калгасам пакуль што надзвычайна слабая. Адзін аграном у раёне ня можа справіцца з аблугоўваньнем усіх калгасаў. І толькі цяпер у калгасах працуе некалькі практыкантаў сельска гаспадарчай Акадэміі, якія складаюць вытворчыя пляны для тых калгасаў, дзе яны да сёньняшняга дню ня складзены. Пры кожным амаль калгасе, праўда, існуюць агранамічныя гурткі, але яны нічога ня робяць.

Нездавальняюча праходзіць работа па абмене звычайнага насеньня на сартавое. Па лініі Райкаапсадсаюзу, які загадвае гэтай справай, абменена насеньня з цэнтралізаваных рэсурсаў толькі 86 цэнт., альбо 21,8 проц. пляну, з унутраных рэсурсаў абменена 49,5 цэнт., альбо 17,7 проц.

Апрамінімум па раёне даведзены да ўсіх сельсаветаў і населішчаў, але выкананьне яго ідзе выключна па галіне ачысткі насеньня. Тут і то маюцца ня ўсюды патрэбныя посьпехі. Адзін толькі **Махіроўскі** сельсавет на ўсе 100 проц. ачысьціў насеньне калгасаў і аднаасобнікаў. У астатніх сельсаветах ачыстка яшчэ праводзіцца.

Апраўпаўнаважаныя, выдуманыя па пунктах сельсаветаў, не праяўляюць актыўнасьць. Ня пры ўсіх сельсаветах праведзены курсы апраўпаўнаважаных. Часта апраўпаўнаважаныя ня ведаюць, што робіць.

Аднако хапае, гэта абежнікаў аб ачыстцы насеньня, аб зборы попелу, аб засыпцы насенных фондаў. Паперкі сыплюцца, як дожд, з боку раённых устаноў. Але паперкамі ўраджайнасьці не падымеш. Паход за ўраджайнасьць на Полаччыне патрэбна ўзьняць на належную вышыню.

Брыгада газ. «Савецкая Беларусь» Я. Саўчанка, У. Л. Скачыха, Хадкевіч, Хв. Сьвірко, Вярбіцкі і А. Грак.

Прасунуць угнаеньне на калгасныя палі

Аршанскі райкалгассаюз ня кіруе разьмеркаваньнем угнаеньняў

Калгасы Аршанскага раёну маюць вялікую патрэбу на ўгнаеньнях. Пляном прадугледжаны завоз штучнага ўгнаеньня, скарыстаньне попелу і вапны.

Ад мінулага году на складах Райкаапсаюзу засталося многа ўгнаеньняў, толькі таму, што яны былі позна завезены. Каля году ляжалі на складах Райкаапсаюзу: 99,5 тон супэрфасфату, 48 тон касьцяной мукі і 47,9 тон фасфарытнай мукі. Каля году яны ляжалі без карысьці, мёртвым капіталам і чакалі вясны. Сёлета гісторыя паўтараецца. Па пляну мяркуецца завезьці да веснавой сяўбы для калгасаў 112 тон супэрфасфату і касьцяной мукі, 297 тон фасфарытнай мукі і 212 тон сільвініту. Ня гледзячы на тое, што сяўба хутка пачнецца з вызначанага ўгнаеньня завезена толькі 17,8 тон. Рэшта ўгнаеньня Белсельснаб абяцае завезьці,—а калі, не відома. Мусіць тады калі скончыцца сяўба. Белсельснаб ніяк ня можа арганізаваць своячасовы завоз угнаеньняў і кожны год даводзіць да таго, што ўгнаеньне застаецца ляжаць альбо ўсё лета, альбо ўсю зіму на складах, а тады, калі патрэбна яго ня.

З другога боку, вельмі дрэнна пастаўлена рэалізацыя тых запасаў угнаеньня, якія маюцца ў раёне. Райкаапсаюз у першую чаргу дае ўгнаець не старым калгасам, апошнія марудзяць браць яго, разважаючы так:

— Угнаеньне нідзе дзенецца, будзе час—забярэм.

Між тым новыя калгасы даўно патрабуюць угнаеньня, але Райкалгассаюз усё чакае, колькі ўгнаеньне станецца ад старых калгасаў і ніга ня робіць, каб прымусіць апош забраць яго. А час ня церпіць. рога хутка сапсуецца і ўгнаеньне жа застацца.

Зусім нездавальняюча пастаўлена справа скарыстаньня ўнутраных сурсаў угнаеньня.

Да веснавой сяўбы калгасы пав ны забраць 139 тон попелу, а забра пакуль што толькі ўсяго 57 тон. В каваньне недапушчальна ганебн Значная частка калгасаў як, напр клад, «Чырвоны Кастрычнік», Бара скага сельсавету, «Вызваленьне жа чыны», «Актывіст», «Юны тварэц камуна «10 кастрычніка» і інш. пон ня зьбіраюць. А ў тых калгасах, попел зьбіраецца, яго дрэнна захо ваюць і ён траціць сваю вартасьц

Толькі справа з забесьпячэньн калгасаў вапнай за апошнія дні зна на пасунулася наперад. Калгасы заб лі 88 проц. патрэбнай для вапнаван ня глебы, вапны. Але ўсё-ж такі ёсь яшчэ частка калгасаў, як калгас і «1 мая» і інш., якія пад уплывам к лацкіх элемэнтаў, пралезьлі ў гэт калгасы, вапну ўсё яшчэ не бяруць.

Райкаапсаюз павінен неадкладна рашуча паставіць пытаньне пер цэнтральнымі ўстановамі і арганіз цыямі аб найхутчэйшым завозе раён угнаеньняў, а Райкалгассаюз п вінен дабіцца, каб прасунуць у калг сы наяўныя ўгнаеньні, забясьпечы стопроцантнае выкананьне пляну з ру попелу і вапнаваньня.

А. Кудрын.

Ня траціць дарэмна гною

Гной, як адзін з галоўных фактараў падвышэньня ўраджайнасьці, павінен быць максымальна скарыстаны. А між тым у нас большая колькасьць гною часта скарыстоўваецца так, што замест падвышэньня ўраджайнасьці атрымліваецца яго зьмяншэньне, г. зн. як-раз наадварот. Факты такога зьніжэньня ўраджайнасьці ўстаноўлены даўно і асабліва ў аднаасобных гарадзкіх і прыгарадных гаспадарках і на вясковых сядзібных гародных вучастках. Здараецца гэта таму, што сядзібныя гародныя вучасткі ад штогоднага ўнясеньня гною пад усе віды гародных культур і бульбу-скарасьпейку настолькі перагружаны, што бульба і большасьць гародных расьлін, як гавораць, буяюць і не даюць нават сярэдніх ураджаеў. Ад лішку ўгнаеньня большасьць гародных расьлін (за ні ключэньнем капусты), маюць здол насьць разьвівацць сваю зялёную ма —нашыньце за кошт стварэньня клуб нёў, карэнёў і плядоў (бульба, бур морква, агуркі і г. д.). Асабліва пер канаецца ў гэтым нашы калгасьнікі, мінулым годзе, калі на свае ўласны і без таго перагружаныя гароды п клалі вялікую колькасьць гною, жа ючы атрымаць большы ўраджай. атрымалася наадварот, ураджай асаб ліва бульбы-скарасьпейкі атрымаў ніжэй, чым на аграмаджаных пал вых пасевах калгасаў.

У выніку, такое няўмелае скары станьне гною прыносіць вялікія стра ты нашай сельскай гаспадарцы і дзя жаве. Мы атрымліваем падвойны н дабор і гароднай прадукцыі і пал вой.

Такое зьявішча больш абсалютна н можа быць цярпімым. У надыходз чую веснавую сяўбу ніводнага цэн гною не павінна быць такім чына растрачана. Асабліва гэта павінн датычыць гарадзкіх і прыгарадных а наасобных гаспадарак, якія прост злачынна псуюць гной і тым самы зьніжаюць ураджайнасьць. А гэт гной, будучы скарыстаны на гародны прыгарадных саўгасах і калгасах, дз гною ня зусім хапае—павялічыць і ураджай.

Ажыцьцяўленьне гэтага надзвычай на важнага мерапрыемства патрабуе:

1. Па лініі Наркамзему неабходнае ўнясеньня дадатковага пункту ў закон аб аграмінімуме — які-б устанаўля унясеньне гною на гарадзкіх пера ўгноеных гародных землях толькі пад капусныя культуры.

2. Па лініі Калгасцэнтру—выданьне асобнай распараджэньня, рэгулюю чага сапраўдныя патрэбы гною на га роды калгасьнікаў.

3. Па лініі гарсаветаў — выданьне асобнай пастановы аб скарыстаньн лішкаў гною ў гарадзкіх аднаасобных гаспадарках.

Аграном РАЎДО.

Ад рэдакцыі: артыкул т. Раўдо друкуецца ў парадку абгаваранньня. Просьба да Белкалгасцэнтру, Наркамзему і гарсавету выступіць на гэтым пытаньні.

ВЫТВОРЧЫЯ НАРАДЫ ПРЫ СЕЛЬСАВЕТАХ—забыты вучастак савецкай работы

Выгнаць з Дукорскага, Горскага і Арлейскага сельсаветаў кулацкіх агентаў. Рашуча павярнуцца тварам да калгаснага руху. Па-бальшавіцку ўзяцца за ажыўленьне работы вытворчых нарад пры сельсаветах

Больш кіраўніцтва вытворчымі нарадамі

Партыя і ўрад наставілі перад сельсаветамі задачу—рашуча павярнуцца тварам да калектывізацыі.

Асноўнай работай сельсаветаў зараз зьяўляецца кіраўніцтва і пашырэньне калгаснага руху, ударная падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны.

Пытаньне барацьбы з кулаком і яго агентурай павінна стаяць у цэнтры ўвагі сельсаветаў.

Аднак друкуемыя сёньня матар'ялы сьведчаць аб тым, што некаторая частка сельсаветаў БССР не разумее сва іх асноўных задач, і часам замест таго, каб стаць сапраўднымі штабамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, натурацюць кулаку.

Факты з практыкі ДУКОРСКАГА сельсавету, СЬМІЛАВІЦКАГА раёну, вельмі яскрава сьведчаць аб тым, што кіраўнікі гэтага сельсавету страцілі сваю клясавую чуласьць, што яны не апраўдалі свайго прызначэньня як прадстаўнікі органу дыктатуры пралетарыяту на вёсцы.

Ня лепш і ў ГОРСКІМ сельсавеце, ГОРАЦКАГА раёну.

Гэтыя сельскія саветы патрабуюць тэрміновага і рашучага аздараўленьня.

Пасьпяховае правядзеньне другой калгаснай вясны патрабуе ад сельскіх саветаў асаблівай клясавай пільнасьці, гібкасьці асабліва напружанай ударнай работы. Гэтыя задачы патрабуюць ад райвыканкомаў сталага штодзеннага кіраўніцтва работай сельсаветаў.

Аднак, з кіраўніцтвам сельсаветамі з боку РВК ня ўсё добра.

Асабліва нездавальняюча абстаіць справа з кіраўніцтвам сельсаветаў у галіне работы вытворчых нарад пры іх. У большасьці сельсаветах вытворчыя нарады не працуюць. Прэзыдыумы сельсаветаў шмат пытаньняў, якія павінны былі папярэдня падрыхтоўвацца вытворчымі нарадамі, разьбіраліся непасрэдна, чым у значнай меры ўбівалі ініцыятыву ўдзельнікаў вытворчых нарад.

Гэткае становішча надалей ня можа так заставацца. Вытворчыя нарады пры сельсаветах павінны быць ажыўлены, РВК павінен неадкладна заняцца сталым кіраўніцтвам работай сельскіх саветаў у галіне ажыўленьня вытворчых нарад. Прэзыдыумы сельсаветаў павінны зараз-жа праверыць работу вытворчых нарад, даць канкрэтныя прапановы ім у іх далейшай рабоце згодна з выданым урадам палажэньнем аб іх.

Р. І.

Пакараць кулацкіх агентаў

Выяўленьне кулацкіх гаспадарак і барацьба з кулацтвам у Дукорскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну, праводзіцца слаба. З боку сельсавету цалкам і паасобных яго працаўнікоў наглядаюцца прымірэнчыя адносіны да кулакоў. Нават ёсьць такія выпадкі, што кулацкім гаспадаркам, якія плацяць звыш 100 руб. сельгаспадатку, сельсавет не дае цьвёрдых заданьняў, а прыраўнаў іх да маламоцных серадняцкіх гаспадарак. Паасобныя члены сельсавету абараняюць кулакоў. У в. Дукора жыве кулак **Мазоўка Захар**, які арандаваў 30 га панаўскай зямлі і меў сваёй уласнай каля 10 га, прымаў наёмную сілу, меў па 15—20 кароў, па 20 штук сьвіньней, па 40 штук авечак. Цяпер мае каля 15 га зямлі, плаціць 102 руб. сельгаспадатку, а Дукорскі сельсавет да гэтага часу ня даў яму цьвёрдых заданьняў. Па вывазцы лесаматар'ялаў ён атрымаў усяго 25 к. мэтр., бо яго абараняюць члены сельсавету **Батучык Кастусь і Чуліцкі.** Але і па сёньнішні дзень ён ніводнага кубамэтру ня выканаў. Заместтаго, каб прыцягнуць гэтага кулака да суровай адказнасьці за зрыў кампаніі, нават ня складзен пратакол.

Сельсавет-жа аб гэтым добра ведае, але злачынна нічога ня робіць. Калі запыталіся ў сакратара сельсавету **Шыдлоўскага** чаму сельсавет ня прымае жорсткіх мер да кулака Мазоўкі—ён адказаў: **«Мы-ж пакуль што ня можам быць нахальнікамі».**

У выніку апартуністычнага кіраўніцтва з боку **Дукорскага** сельсавету—калгасны рух праходзіць мімо батрацка-бяднацкай часткі насельніцтва, якое ўваходзіць у калгасы ў вельмі нязначнай колькасьці.

Так, у калгасе «імя Х зьезду саветаў»—9 батрацка-бяднацкіх гаспадарак, у калгасе «імя Х зьезду ЛКСМБ»,—усяго адна бяднацкая гаспадарка, у калгасе «Праца»—таксама толькі адна, у калгасе імя ЦВК БССР—тры і г. д.

У той-жа час калгасы засьмечаны кулацка-заможнымі гаспадаркамі, якія пралезьлі ў калгасы з мэтаю падрыву іх работы. Напрыклад, у калгасе «імя Х зьезду саветаў»—7 кулацка-заможных гаспадарак, у калгасе «імя 16 партызан»—2 (гаспадаркі Пісачыка і Мазоніна), у калгасе «імя ЦВК БССР»—4 і г. д.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што Дукорскі сельсавет страціў клясавую пільнасьць.

Мы патрабуем ад Сьмілавіцкай пракуратуры, РВК, райкомаў партыі і камсамолу —самым тэрміновым парадкам разагнаць і сурова пакараць кулацкіх агентаў з Дукорскага сельсавету і камсамольскай ячэйкі.

Т.

Узор апартуністычнай практыкі

ПОЛАЦАК (наш кор). Калі прыехаў мы з раёну брыгадзіры запыталі сакратара **Арлейскага** сельсавету т. Равіну, як абстаіць справа з падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай вясны, дык атрымалі ад яе вельм дзівосны адказ:—У нас пасеўкампанія закончылася...

Тав. Равіна лічыць, што са скачэньнем давядзеньня пасеўных пляноў да двара скончана таксама і ўся падрыхтоўка да сяўбы. Гэты адказ сакратара Арлейскага сельсавету не выпадковасьць. Арлейскі сельсавет даўно заслугоўваў ўвагі прамадзкасьці сваёй апартуністычнай дзейнасьцю. Кіраўніцтва сельсавету не палічыла патрэбным з самага пачатку зімы разгарнуць сталую работу па ўмацаваньні арганізаваных калгасаў і гэтым самым утварыць грунт для новай хвалі калгаснага прыліву.

Існуючыя на тэрыторыі сельсавету калгасы не зьяўляліся дагэтуль прыкладам для аднаасобнікаў. Перавыбары праўленьняў не пасунулі справу разьвіцьця гэтых калгасаў наперад. Старшыні калгасаў **«Шлях Леніна»** і **«Прамень Леніна»** партыйцы **Макараў і Семчанка** па два месяцы ня прымалі спраў ад былых старшынь. Больш двух месяцаў не праводзілася паседжаньняў праўленьняў—якія такім чынам зрывалі своячасовую падрыхтоўку да надыходзячай калгаснай вясны. Гэтыя калгасы нават ня склалі падрабязных вытворчых плянаў на час сяўбы. Ачыстка насеньня і рамонт інвэнтара толькі цяпер заканчваюцца.

У трэцім калгасе **«Пралетары»** становішча яшчэ горшае. Старшыня калгасу **Шашын** вядзе гаспадарку да развалу, ня кіруючы калгасным жыцьцём, а наадварот дэзарганізуючы яго. У калгасе не наладжана арганізацыя працы. Няма сталых брыгад, праца ідзе самацёкам як і што каму ўздумаецца, адсутнічае сацыялістычнае спаборніцтва. Дрэннае становішча калгасаў прывяло да таго, што бедняк і серадняк ня хочуць уліваца ў старыя калгасы, з якіх, пасьля растлумачальнай работы згодны арганізаваць новы калгас з якіх небудзь 5—7 гаспадарак. Не дарма-ж за дэкаду сталінскага прыліву ў калгасы ўступіла, вярней арганізавалася, 11 аднаасобнікаў. Усяго-ж калгасамі ахоплена па сельсавеце толькі 64 гаспадаркі пры наяўнасьці 530 двароў агулам.

Самы склад сельсавету не зьяўляецца здольным чотка ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі. Старшыня сельсавету **Шалудкевіч** дзейнічае чыста адміністрацыйным мэтадам, не зьяўляючыся арганізатарам шырокай растлумачальнай работы. Члены сельсавету часам выступаюць з дзеньгамі, наскрозь прасякнутымі кулацкімі настроямі. Прыкладна, член сельсавету. **Плоскі** на пленуме сельсавету па адрасу праводзімых партыяй і савецкай ўладай мерапрыемстваў кінуў, **навошта нам пасеўны плян, навошта ўсяваемыя калгасы, калі ў гэтых калгасах жывецца горш чым бедняку-аднаасобніку».(?!).**

Другі член сельсавету **Сядуноў Раман**, з хут. Альшавікі згрупаваў вакол сябе падкулачнікаў і варожыя элемэнты, вядучы з імі кулацкую агітацыю. Сядуноў не аднойчы ўжо зрываў сходы па пасеўкампаніі і кантрактацыі.

Партыйная ячэйка на чале з сакратаром **Махначом** не паклапацілася аб тым, каб забясьпечыць сельсавет чоткім, партыйным кіраўніцтвам. І нічога дзіўнага таму, калі **Макараў** і Семчанка члены гэтай ячэйкі не жадаюць наладзіць работу ў калгасах, дзе яны зьяўляюцца старшынямі. Нічога дзіўнага, што ўся ячэйка цалкам не паставіла ў цэнтры ўвагі работу з беднатой, не паребудавала ўсю сваю дзейнасьць тварам да сяўбы і калектывізацыі. І калі аднойчы, пад націскам прыехаўшых з раёну брыгадзіраў, склікалі партыйна-камсамольскі закрыты сход, дык нават ня ўсе партыйцы зьявіліся, а камсамольская ячэйка проста ўсім сваім складам ня прышла на сход.

З прычыны такіх адносін падрыхтоўка да сяўбы не набыла патрэбных тэмпаў. Працуючыя чатыры кузьні не адрамантавалі і паловы інвэнтара аднаасобнага сэктару. Калгасы і то не гатовы яшчэ да пробных выездаў.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што побач з сельсаветам знаходзіцца гута «Праца» з буйным партыйным і камсамольскім калектывам. Але партыйна-камсамольская арганізацыя гуты це ажыцьцёвіла свайго шэфства над Арлейскім сельсаветам, не дапамагла зьнішчыць ганебнага становішча ў сельсавеце.

Па адносінах да Арлейскага сельсавету патрэбна прыняць катэгарычныя меры, накіраваныя на ліквідацыю наяўнасьці апартуністычнай дзейнасьці: Трэба рашучым чынам аздаравіць партячэйку і кіруючы склад калгасаў.

Баз. Румянец.

Усеагульнае навучаньне пад пагрозай зрыву

Справа ўсеагульнага навучаньня на **Гарадзішчанскім сельсавеце** (Шклоўшчына) абстаіць зусім дрэнна. Дзякуючы нядбайным і безадказным адносінам да гэтага пытаньня сельсавету і камісіі сядзейнічаньня ўсенавучу, да гэтага часу не арганізаваны лікпункты па вёсках Гарадзішча, Літвішавічы, Русакі. Па вёсках Сярціслаўль і Масеенкі заняткі сыстэматычна зрываюць самі кіраўнікі. Плянаў работы зусім няма. Работа ідзе самацёкам.

Ня лепш справа і з работай школ. **Да гэтага часу ня ўсе школы прымаваліся да вытворчасьці—калгасаў (як напрыклад Сярціслаўль», Карасі). Аб палітэхнізацыі ў школах у нашым сельсавеце нічога ня чуваць. Нават Гарадзішчанская 4-намплектная школа пры ШКМ у гэтым напрамку нічога ня робіць у той час, як усе магчымасьці для палітэхнізацыі ў ёй ёсьць.** Сапспаборніцтва паміж школамі не праявяецца і застаецца ў большасьці на паперы. **Падвоз дзяцей і гарачыя сьнеданьні арганізаваны толькі ў адной Навасёлкаўскай школе.** Вопратка, якая атрымліваецца для дзяцей беднаты, пралежвае ў шафах па два месяцы, раней чым падае да вучняў.

Такое становішча з усеагульным навучаньнем патрабуе хутчэйшага пералому. Сельсавет і мясцовыя арганізацыі павінны павярнуцца тварам да гэтага адказнейшага вучастку культурнага будаўніцтва.

М. Кульгавы.

Абуткам забясьпечылі дзяцей... кулакоў

Прыцягнуць да адказнасьці настаўніцу Шахоцька

Дзеці беднаты **Дукорчанскай** школы (Сьмілавіцкі раён) па віне настаўніцы Шахоцька, не забясьп

Адсутнасьць кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам--

прычына невыкананьня на радзе прадпрыемстваў БССР прамфінпляну першага кварталу

Дзе трохкутнікі перабудавалі сваю работу адпаведна з пастановай ЦК УсеКП(б), там забясьпечана поўнае выкананьне прамфінпляну

„Гомсельмаш", „Ударнік", „Энэргія", „Камунар", „Камінтэрн", „Полымя Рэвалюцыі", „Прафінтэрн", „Пралетары", „Сьцяг Сацыялізму",—з вялікай запазычанасьцю дзяржаве ўступілі ў другі квартал

Менская шчотачная фабрыка імя Крупскай, Бабруйская шчацінная фабрыка, „Бальшавік", Гомельскі скурзавод, „Кастрычнік", Гомельская шчацінная фабрыка—перавыканалі прамфінплян

Другому рашаючаму кварталу даць рашаючыя тэмпы!

Зводка выкананьня прамфінпляну па прамысловасьці БССР за 1 квартал трэцяга рашаючага году

Мэталяапрацоўчая прамысловасьць БССР свой прамфінплян першага кварталу выканала наступным чынам па асобных галінах: барон—23,2 проц., плугоў—64,6 проц., сілясарэзак—60,6 проц., саламарэзак—26,8 проц., камнядробілак—68,4 проц., рэшчэрамяшалак—18 проц., гравійсартыровак—61,4 пр., лобёдкі—50,8 проц., торфмашыны—25 проц., варштаты Сьмірнова—59,6 проц., сьвідравальныя варштаты—100,7 проц., ніскі—51,5 проц., цьвікі—84,1 проц., карыдрэзкі—11,8 проц.

Цагельная прамысловасьць выканала прамфінплян першага кварталу наступным чынам: заданьне было ў 10.518 штук цэглы абжыгу, выканана 9.418 штук, што дае 89,5 проц.

Шкляная прамысловасьць замест 6850 тон шкла на пляну дала 4556,8 тон, што складае 68 проц.

Фанэрная прамысловасьць замест 1535,4 куба-мэтраў паводле пляну, выпрацавала толькі 10710,9 куба-мэтраў, што складае 69,8 проц.

Хэмічная прамысловасьць замест 8790 тон фасфарытнай мукі выпрацавала толькі 4882,3 тоны, што складае 51 проц.

Гарбарная прамысловасьць выпрацавала буйных скур 90,1 штук, замест плянавых 109,9, што складае 82 проц., дробных скур 453,6 штук замест плянавых 448,8, што складае 103 проц.

Нарымарна-сядзельная прамысловасьць паводле пляну было выканана выпрацаваць 12.000 штук сырамятнікаў, а фактычна зроблена 14.000 штук, што дае 16,7 проц. перавышэньня пляну.

Тэкстыльная прамысловасьць павінна была даць паводле пляну: прадзіва 977 тон, а дала 778,2 тоны, што складае 79,7 проц. пляну; бавоўнянай тканіны замест 1.451.000 мэтраў паводле пляну, выпрацавана 1.519.800 мэтраў, што дае 107,4 проц.; суконнай тканіны выпрацавана замест 60,1 тысячы мэтраў паводле пляну—60,7 тысяч мэтраў, што дае 101 проц.

Абутковая прамысловасьць выпрацавала розната абутку замест плянаванага заданьня ў 825,3 тысячы пар, толькі 649,5 тысяч пар, што складае толькі 78,7 проц. выкананьня пляну.

Добра выканалі свае вытворчыя заданьні першага кварталу: Менскі завод «Бальшавік» (102,5 проц.), Гомельскі скурзавод (107,7), фабрыка «Кастрычнік» (111,6), Менская шчотачная фабрыка імя Крупскай (106), Бабруйская шчацінная фабрыка (102,9), Гомельская шчацінная фабрыка (102,8), Віцебская валасапрадзільная фабрыка (101,2).

Ударнікі-каменшчыкі на пабудове кандытарскай фабрыкі.

Дрэнна выканалі прамфінплян першага кварталу: Гомсельмаш (52,9), завод «Ударнік» (44,7), завод «Энэргія» (72,5), «Камунар» (73,1), фабрыка «Камінтэрн» (46,8), завод «Полымя Рэвалюцыі» (71,7), гута «Пралетары» (85), гута «Камінтэрн» (73,3), фабрыка «Бярэзіна» (82,4), фабрыка «Прафінтэрн» (91,7), фабрыка імя Дзяржынскага (85,7), «Сьцяг індустрыялізацыі» (73,9), Віцебская шчацінная фабрыка (98,4), Менская шчацінная фабрыка (98,6) і Віцебская шчотачная фабрыка імя «Крупскай» (97,4).

119 процантаў выкананьня прамфінпляну на калінкавіцкім лесазаводзе

Прамфінплян першага кварталу 1931 г. Калінкавіцкім лесапільным заводам перавыкананы на 19 проц. Гэта значнае дасягненьне.

Але ёсьць рад недахопаў. На заводзе адсутнічае стале кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Не вядзецца амаль ніякай культвыхаваўчай работы з рабочымі. Ніхто за лепшыя паказьнікі работы не прэміраваны. Наглядаюцца настроі рвацтва з боку пасобных рабочых. Гэта сьведчыць аб тым, што плян выконваўся самацёкам і ставіць пад пагрозу яго рэальнасьць, неабходнасьць перагляду ў бок павялічэньня. Пры іславаньні мэтадаў ударніцтва і спаборніцтва плян мог-бы быць выкананы значна больш. Адміністрацыі заводу і фабкому неабходна ўлічыць усё гэта і другі квартал працаваць на ўдарнаму.

Пчала.

Поўная адсутнасьць сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе „Зьвязда"

На першым вечары ўдарнікаў заводу «Зьвязда» стаяла пытаньне аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Выступаўшыя рабочыя на гэтым вечары адзначылі, што слаба разгорнута ўдарніцтва. Няма ніякага кіраўніцтва з боку парткалектыву і камсамолу. Моладзь і камсамол часта зрываюць работу ўдарных брыгад, як напрыклад, Дзечка, Коцік і інш. Нават даходзіць да таго, што адна брыгада крадзе матар'ялы ў другой брыгады.

Рабоце ўдарных брыгад перашкаджае тое, што заўком і адміністрацыя заводу ніякіх сходаў і нарад з ударнікамі не праводзяць і не вядуць сярод іх ніякай культурна-выхаваўчай работы. На заводзе адсутнічаюць плянава-аператыўныя групы, рабочыя нават ня ведаюць, што гэта за групы.

Неабходна прарабіць наступнае для разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе «Зьвязда»:

Заключыць сацумовы паміж пасобнымі брыгадамі; давесьці заданьне да кожнага цэху, варштату, і да пасобнага рабочага; выявіць дрэнных ударнікаў; далучыць кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, рэгулярна склікаць і праводзіць нарады з ударнікамі, практычна ажыцьцяўляць канвэерную сыстэму працы на заводзе. Вось, тое каб крытыкаваць, што трэба зрабіць па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе «Зьвязда».

Грышна Зубасты.

„Герой Працы" чакае торфу

З прычыны таго, што **Дабрушскі торфазавод «Шлях сацыялізму»** ня выве з балота 70 тыс. тон торфу, фабрыка «Герой працы» зараз ня мае паліва. Гэта зрывае выкананьне прамфінпляну фабрыцы «Герой працы». Між тым, на ўмове торфазавод павінен поўнасьцю забясьпечыць фабрыку торфам.

Белторф павінен зьвярнуць увагу на торфазавод «Шлях сацыялізму», які такім чынам затрымлівае выкананьне прамфінпляну фабрыцы «Герой працы».

М. Левікоў.

Бальшавіцкі адказ тульскім рабочым

На заклік да шахцёраў Данбасу

аб забясьпечаньні краіны апалам напружым усе сілы для забясьпечаньня Данбасу лесаматар'яламі

Рабочыя Тульскага заводу № 1 кінулі заклік да шахцёраў Данбасу, забясьпечыць краіну апалам. Данбас прымае гераічныя меры для таго, каб выканаць свой пяцігадовы плян, які мае рашаючае значэньне для ўсяго будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці.

Выкананьне пяцігодкі апалу зьяўляецца справай ня толькі шахцёраў Данбасу, але ўсяе рабочае клясы, якая павінна прымаць самы шырокі ўдзел у гэтай рабоце.

На нас, дрэваапрацоўшчыкаў, таксама ўскладзены вялізарныя задачы. Беларускія лесапільныя заводы зьяўляюцца сыравіннай базай для адгрузкі скрэпачных матар'ялаў Данбасу. Мы здавальняем 30 проц. усёй патрэбнасьці ў гэтых матар'ялах. Беларускія Леспрамгасы забясьпечваюць Данбас спэцыяльнай руднічнай стойкай ў гэткай-жа колькасьці.

Данбас кідае трывожныя сыгналы аб тым, што яму не хапае скрэпачных матар'ялаў. Мы ня можам дапусьціць прарыву.

Мы, рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» зварочваемся з заклінам да шматлікага атраду ўсіх рабочых дрэваапрацоўшчыкаў БССР, да ўсіх Леспрамгасаў, да ўсіх чыгунач нічаў прыняць меры для таго, каб забясьпечыць Данбас яснымі матар'яламі.

Мы абавязваемся ў парадку пралетарскага кантролю прасачыць як завод адгружае матар'ялы.

А што вы робіце для гэтай мэты? Чакаем ад вас адказу.

— Працягваем руку дапамогі Данбасу.

Рэзалюцыя прынята на агульным сходзе рабочых мэханічнага цэху заводу «Дрэваапрацоўшчык» 10 пра савіка 1931 г.

Прарывы ў прамысловасьці Бабруйску павінны быць ліквідаваны

БАБРУЙСК. (Наш кар.). З агульнай колькасьці 19 прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Бабруйскага раёну, праграму першага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі выканалі толькі 9 прадпрыемстваў.

Столяр-ударнік на пабудове кандытарскай фабрыкі тав. БАРАНАЎ.

На першым месцы из выкананьні ны творчай праграмы ідзе мармаладная фабрыка «Чырвоны харчавік» (130%), за ёй друкарня Белпалітграфаб'яднаньня (109 проц.), шчацінная фабрыка, тарэлачны завод і т. д.

Буйнейшыя бабруйскія прадпрыемствы (камбінат і шпэйнай фабрыка) выканалі свой прамфінплян за першы квартал са значнымі прарывамі. Па астатніх больш дробных прадпрыемствах (мэблявая фабрыка, завод імя Сталіна) ёсьць таксама значныя прарывы.

Асабліва вялікі прарыў мае завод імя Сталіна, які выканаў прамфінплян першага кварталу бягучага году на выпуску цагельных агрэгатаў на 45%. Вурокі, якія павінны былі-б даць рэзкі пералом у рабоце заводу ў сувязі з ранейшаю пастановаю бюро райкому КП(б)Б аб зьмяшчы з заводу імя Сталіна. Але яны, як відаць яшчэ не навучылі заводзкія арганізацыі.

Як і раней на заводзе панае безгаспадарчасьць. Абсталёўваецца завод надзвычайна марудна. Безгаспадарчасьць выяўляецца яшчэ і ў тым, што вялікая колькасьць апалу і сыравіны, страчаная з прычыны безгаспадарчасьці, сьпісваецца ў выдатак. На заводзе меў месца факт, што адміністрацыя хацела сьпісаць каля 25 тон чыгуну, які знаходзіўся пад сьнегам. Адміністрацыя не хацела займацца адшуканьнем яго.

Брак—асноўная хвароба заводу імя Сталіна. Адсутнасьць належнага кантролю з боку тэхнічнага персаналу за работай асобных вучасткаў заводу прыводзіць да значнага браку. Гэтая-ж адсутнасьць кантролю дае ў выніку тое, што ў фанэрным цэху Бабруйскага камбінату з першагатункавай сыравіны выходзіць прадукцыя трэцяга гатунку. Вялікая колькасьць браку назіраецца і на швэйнай фабрыцы.

Недапушчальным зьявішчам у прамысловым жыцьці Бабруйску зьяўляецца і тое, што хлебазавод да гэтага часу ня мае свайго прамфінпляну, працуе па саматужнічку, бясплана.

Сярод рабочых бабруйскіх прадпрыемстваў слаба разгорнута спаборніцтва і ўдарніцтва. Імі ахоплена ўсяго толькі 30 проц. агульнага ліку рабочых. Сабекошт прадукцыі павялічваецца, як прагулаў за першы квартал 1931 году ўзрос з 12 да 16 проц.

Апошні пленум раённага камітэту партыі, падводзячы вынікі выкананьня прамфінпляну за першы квартал, рашуча паставіў пытаньне перад партарганізацыямі аб ліквідацыі маючыхся прарываў, занісаўшы ў сваёй пастанове: «ня можа быць члена партыі або камсамолу, які ня ўдзельнічае ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве». У сваіх пастановах пленум вялікую ўвагу аддаў папулярызацыі сярод рабочых і працоўных мас адозвы тульскіх рабочых. Шырокая папулярызацыя гэтага вялікай палітычнай важнасьці дакумэнту павінна даць новы ўздым творчага энтузіязму працоўных, новую магутную хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, паскарэньне працоўны ўздым на пасьніховае выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Д. Аланскі.

Замест нягоднага шкла, шклоаб'яднаньне высылае добрыя шліфаваныя люстры

(Сьвіслацкі раён).

Для гуты «Кастрычнік» для расьціркі фарбаў вельмі неабходна грубое шкло. Дырэктар заводу т. Кісялёўскі, буючы ў Менску прасіў Белшклоаб'яднаньне, каб яно закупіла ў Менску патрэбнае шкло хоць бы з абломкаў, якія застаюцца пры вырабе люстраў.

Гэтымі днямі завод атрымлівае ад Белшклоаб'яднаньня адносіну і накладную—рахунак з крамы Менскага ЦРК праз Менскую зрэцель люстроўнічыкаў 19 шт. люстраў на суму 247 руб. Люстры без рам, зусім прыгодныя, каштоўныя, але яны непатрэбныя заводу для расьціркі фарбаў.

Вось гэта адносіна: «мы прасілі вас закупіць нам і адправіць тоўстага шкла, адкідаў бітых-нягодных, якія маюцца ў Працкалектыве люстроўнічыкаў па Койданаўскай вул., для расьціраньня фарбаў.

Здаецца ясна, але чамусьці нам прыслалі шліфаваных люстраў 19 шт, на 247 руб.

Нам гэткія люстры непатрэбны, бо мы цырульні адчыняць не зьбіраемся.

Просьба расьсьледаваць гэтае пытаньне».

Вельмі цікава, хто мог дадумацца да такога галавацяпства, палічыўшы завод за цырульню?

Неабходна належным органам праверыць гэтае пытаньне і даць па руках тым, хто дапусьціў такую адпраўку добра разумеючы, што для расьціркі фарбаў непатрэбны прыгодныя люстры, а проста грубое шкло, такія адпраўкі толькі зрываюць работу.

Іх можна кваліфікаваць як шкодніцтва.

А. Гарэцкі.

Шчацінна-шчотачная прамысловасьць павінна быць забясьпечана сыравінай

Шчацінна-шчотачна-валасапрацоўчая прамысловасьць адыгрывае пямалважную ролю ў народнай гаспадарцы БССР.

Яна забясьпечвае нашу прамысловасьць і будаўніцтва, неабходнымі інструментамі і шаўфабрыкатнай сыравінай. Яна абслугоўвае шырокія патрэбы працоўнага насельніцтва. Акрамя таго значная частка не прадукцыі экспартуецца за мяжу і яна зьяўляецца адным з валютных фондаў.

Таму ў загатоўцы шчаціны павінны быць узяты бальшавіцкія тэмпы для таго, каб забясьпечыць поўнасьцю шчацінна-шчотачныя і валасапрацоўчыя фабрыкі сыравінай. Кожны кал гасьнік, адналасобнік, бядняк і сярэдняк, павінны быць зацікаўлены ў зборцы і поўным выкананьні загатоўчага пляну шчаціны і конскага воласу.

Треба адзначыць, што да гэтага часу ў выказаньні прамфінпляну па гэтай прамысловасьці належнай увагі і перадусім няма ў добры бок. Весткі, які прыносяць з розных раёнаў БССР рабочыя брыгады сьведчаць аб недапушчальных адносінах да загатовак шчаціны і конскага воласу з боку раённых арганізацый.

Вакол гэтай важнейшай гаспадарча палітычнай кампаніі яшчэ не мабілізавана грамадзкая думка калгасьнікаў і бядняцка-сярэдняцкай часткі вёскі.

Асабліва дрэнныя адносіны да загатоўкі шчаціны і воласу паказваюцца з боку Белмяса і Саюзскуры, якія замест паладжваньня і арганізацыі выдзіраньня шчаціны, займаюцца размовамі, а шчаціна тым часам смаліцца і прападае.

Апарат Белпушчаціны таксама яшчэ ня стаў баявым штабам работы па зборы шчаціны і воласу, аб гэтым гавораць такія факты, як позьняя прапрацоўка пляну, слабае інструктаваньне брыгад і г. д.

Шчаціна і конскі волас у БССР ёсьць. Толькі недацэньваючыя гэтай важнейшай справы могуць адмаўляць гэта, спрабуючы апраўдаць свае нежаданьне працаваць з тым, каб разгарнуць і стаць на чале шчаціназагатоўчай кампаніі.

Цэнтральныя загатоўчыя арганізацыі павінны зараз-жа праверыць на справе, а не па вестках ход загатовак шчаціны і воласу, перавесьці работу сваёй нізоўкі на сапраўды бальшавіцкія тэмпы, ажывіць работу апарату, прыцягваючы да гэтай работы калгасьнікаў, беднякоў і сярэднякоў.

Саюзмяса і Саюзскура павінны неадкладна арганізаваць правільнае і поўнае выдзіраньне шчаціны.

Калгасцэнтру і Сьвінаводтрэсту патрэбна тэрмінова спыніць псаваньне (асмаленьне) шчаціны, арганізоўваючы выдзіраньне або здачу скур з шчацінаю Саюзскўр.

Згуртаваньне калгасных мас, беднаты, сярэднякоў, мабілізацыя ўсіх сіл на поўнае і своячасовае выкананьне пляну загатовак шчаціны і конскага воласу павінна стаць асноўнай работай усіх загатоўчых арганізацый.

Мы патрабуем ад усіх арганізацый і ў першую чаргу ад загатоўчых ня ўрываць пляну загатовак шчаціны і конскага воласу.



Столяр-ударнік на мантажу кандытарскай фабрыкі тав. ГОЛЬДБЕРГ.

Блюмкін.

Пераплётны цэх друкарні Сталіна

на 112,9 проц. выканаў сваё заданьне першага кварталу

Сакавік месяц, у друкарні імя Сталіна быў пераломны месяц у выкананьні прамфінпляну.

За студзень месяц прамфінплян выкананы на 96,5 проц., у лютым 90,5 проц., сакавік даў 100,6 проц. выкананьня прамфінпляну. Наогул прамфінплян за першы квартал трэцяга рашаючага году па друкарні імя Сталіна выкананы на 95,87 проц.

Асобныя цэхі, як напрыклад пераплётны датэрмінова скончыў свой прамфінплян па 5 дзён, літаграфскі цэх на 4 дні раней тэрміну скончыў сваю вытворчую праграму. З недавыкананьнем пляну выйшлі наборны і друкарскі цэхі.

Упераадзе ўсіх цэхаў у выкананьні прамфінпляну ідзе пераплётны цэх, які сваё вытворчае заданьне за першы квартал выканаў на 112,9 проц. Пераплётны цэх таксама мае дасягненьні і па якасьці прадукцыі, але ў параўнаньні з ростам колькасных паказьнікаў якасьць адстае.

Вытворчыя камуны пераплётнага цэху сябе апраўдалі. Выпрацоўка камун значна павысілася. Напрыклад, камуна брашуроўшчыц павялічыла сваю выпрацоўку на 20 проц. Такое становішча і з ратацыйнай камунай. Ёсьць зрух у гэтых цэхах і ў падвышэньні прадукцыйнасьці. Процант прагулаў і спазьненьняў значна зьнізіўся, але ўсё-ж моманты спазьненьня яшчэ маюцца.

Камуна 13 Кастрычніка таксама з поспехам скончыла сваю праграму трэцяга кварталу. Камуна ўзяла на сябе абавязак даць на кожнага камунара па 14.000 знакаў у дзень. Камунары ўвесь час перавыконваюць гэтыя лічбы.

У месячнику штурму камуна ўзяла на сябе абавязак даць эвыш свайго заданьня 400.000 знакаў. Да канца месяца гэта лічба перавыкананa. У адносіне якасьці прадукцыі камуна 13 Кастрычніка стаіць на першым месцы. Заўважаныя недахопы ў працы камуны выпраўляюцца ў працэсе работы. Камуна шмат палягчае працу верстальшчыкам, расставіўшы лёлькі брашуры на чарзе на дошках чаму верстальшчыку ня прыходзіцца шукаць асобных сталбцоў набору.

Асноўныя недахопы, якія маюцца ў друкарні імя Сталіна, гэта недастатковая якасьць прадукцыі. Гэта гаворыць за тое, што рабочыя масы друкарні не дастаткова мабілізаваны на аўладаньне тэхнікай на прадпрыемстве. Большы паловы рабочых мала кваліфікаваны і частка з іх ня ведае сваіх варштатаў, на якіх яны працуюць. За гэты месяц мелася паломка саманакладу і паломка лінатыпу. Усё гэта трэба аднесьці за кошт таго, што трыкутнік ня оклаў адпаведных турткоў на вывучэньні тэхнікі машын і па падвышэньні кваліфікацыі рабочых.

Гэта трэба ў большай сваёй частцы аднесьці за кошт ФЗК, які не мабілізаваў ударнікаў на вывучэньню тэхнікі, на падвышэньне кваліфікацыі рабочых.

Сакавік месяц упёс значны зрух у работу фабкому друкарні, але гэтая работа яшчэ не замацавана. У сакавіку м-цы праведзена праверка сацумоў, трэба адзначыць, што ўдарнікі выконваюць ўзятыя на сябе абавязкі. Трэба адзначыць таксама і тое, што сярод саміх ударнікаў ёсьць і лжэўдарнікі, якіх пры праверцы выяўлена 25-30 чал. Гэта сыгналізуе аб тым, што і надалей трэба весьці работу па выяўленьню лжэўдарнікаў, якія перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну.

Апошні вучастак работы—гэта культурна-выхаваўчая праца сярод рабочых друкарні. Фабзаўком паставіў пытаньне перад ЦП Саюзу аб перадачы клюбу друкарні. Гэта пытаньне выраша на ў карысьць друкарні.

І. М.

ЗЬМЯНЯЕЦЦА ТВАР РАБОЧАГА

Камуна ня толькі ліквідавала брак, палепшыла якасьць прадукцыі і спыніла сваркі ля канвэйеру. Калі-б гэта было толькі так, дык трэ было-б прызнаць усё гэта нармальным. Ці-ж не ў парадку рэчаў тое, што рабочы ня сварыцца ля варштату, або добра адносіцца да варштату? Дык гэта-ж не асаблівая заслуга, а абавязак кожнага сьвядомага рабочага.

Але камуна перакроіла рабочага-адасобніка, перакроіла вытворніка, перакроіла асобу, зьмяніла ў гэтай асобе—выдзіраніка-ўласьніка.

Лунінскі—адзін з арганізатараў камуны. Лунінскі добры рабочы. Хуткасьці і дакладнасьці ў рабоце Лунінскага зайздросьцяць многія. У Лунінскага звычкі, з імі ён яшчэ не разьвітаўся, звычкі адмоўнага парадку. Спачатку камунары ішлі яму на «ўступкі». Лунінскаму было дазволена выходзіць пакурыць.

— Бяз курава вымя тэмпаў!—гаварыў Лунінскі.

«Уступка» была зроблена з агаворкай: «Лунінскаму дазволіць курыць ня больш 3 хвілін і пры ўмове калі гэта дазваляе канвэйер».

Адночы Лунінскі пакінуў варштат, каб пакурыць. Канвэйер літаральна заклідваў фрэзыроўшчыкаў абуткам. У фрэзыроўшчыкаў стварыўся затор. У гэты дзень у вытворчым пляне камуны стварыўся значны прарыў. З гэтага дню Лунінскаму было адмоўлена ва «ўступцы». З гэтага дню Лунінскі ня йдзе курыць.

— І нічога, жыву і працую,—гаворыць ён.

У камуне свой табель, свая рэгістрацыя. Свой табаль яны называюць «жанглёрным». Быў-жа выпадак, калі ў цэхавым табелі сказалася, што адзін з камунараў працуе, а на самой справе ён быў хворы.

Мы перабралі табаль за ўвесь час існаваньня камуны і не знайшлі вядомага прагулу, праведзена спазьненьня.

— Ці няма ўраўніловкі ў зарплаце?

Гэта пытаньне міжволька паўстае тады, калі мы маем справу з вытворчай камунай. А працаўніка камуны на тэрыторыі коміку часта выяжджаюць.

— Пад адзін грабежчык, выходзіць, і кваліфікаванага і некваліфікаванага. Аддай, бач, сваю зарплату, а мы не ў камуне і падзелім! Не, браточкі, дзякую!

Таму, калі мы гаворым аб камуне фрэзыроўшчыкаў, нельга абыйсьці гэтае вузлавое пытаньне.

Як разьвязана пытаньне аб зарплаце?

Быў узяты сярэдні заработак кожнага з камунараў і з гэтага сярэдняга заработку і выходзілі. Былі вылучаны чатыры групы на кваліфікацыі. Першая група атрымлівае 38 проц., другая—31 проц., трэцяя—29 і чацьвертая—24 проц. Трэба сказаць, што разьмеркаваньне па групах было зроблена така удала, што ня выклікала ніякіх канфліктаў з боку яной-бы то ня было групы.

— У нас «ураўніловкі» няма,—адказвалі на наша запытаньне ўсе камунары.

— Як-жа адбываюцца пераводы з адной групы ў другую?

— Ці вымя «заседжваньню» у групах?

Гэтыя два пытаньні ня менш важныя.

Аказваецца, што ў выніку хуткага пераводу з адной групы ў другую, у выніку хуткага ўздыму кваліфікацыі, —другая група цяпер зусім зьнішчана таму, што камунары гэтай групы перайшлі ў першую, вышэйшую групу.

На першых часох зарплата больш кваліфікаваных некалькі зьнізілася, а менш кваліфікаваных узьнялася. Гэта і зразумела таму, што «захватніцтва» было зьнішчана. Але пасьля і зарплата першай групы павялічылася.

На Менскай абутковай фабрыцы—1018 рабочых. На фабрыцы 28 ударных брыгад і 49 камун. 49 камун—гэта 49 ячэек камуністычных адносін да вытворчасьці, гэта 49 перакроіных майстэрняў для рабочага вытворцы, у рабочага гаспадара фабрыкі, гаспадара краіны. Фрэзыроўшчыкі лічацца лепшымі з 49 камун. Астатнія робяць гэты-ж шлях, але больш павольна. У калонных нівавагы мясцовыя арганізацыі і майстры. Адміністрацыя досыць рэзка рэагавала на гэткую навольнасьць. У адным з дакумэнтаў мы чытаем:

— Калі майстры Рольбін і Пасынкоўскі ня здолеюць на наступным паседжаньні інфармаваць аб іх актыўным удзеле ў рабоце камун і ўдарных брыгад, дык паставіць пытаньне аб зьмяні іх з работы.

* * *

Калі ля фрэзыравальных машын стаіць рабочы ў шубе і шапцы, калі ён выхоплівае з канвэйера абутак і ўважліва яго разглядае або стаіць ля варштату і проста працуе, дык ведайце гэта дзяжурны камунар.

У камуне прарыў.

— Мы адказваем за працэс пашкам.

— Мы адказваем за якасьць.

Таму дзяжурны на ўсіх зьменах бывае ў цэху, будзь гэта ўдзень, будзь гэта ўночы і дапамагае ліквідаваць пчыляны, якія часам пагражаюць ператварыцца ў прарывы.

Вось учора, прыбег у цэх да фрэзыроўшчыкаў майстар.

— Хлопцы, пяткі пайшлі дзень. Абсацы ня трымаюцца, браку колькі нарабілі. Можа яшчэ аднаго фрэзыроўшчыка настаўіць?

— Ты кінь, самі знацьнем!..

І да вечара абсацы пайшлі добрым.

— Камунар не пакідае варштату да таго часу, пакуль ня прыдае зьмене!

Гэта ня толькі прынцып. Гэта вынік сьвядомых адносін да вытворчасьці. І ня рэдка, калі зьмена ня прыходзіць (хвароба) камунар не адыходзіць ад варштату, хоць-бы яму давялося працаваць дзьве зьмены за-раз.

Майстром мэханічнага цэху заўздро сьцяць.

— Табе лафа, а я, браток, па паўдня лётаю па фабрыцы, шукаючы замены. Табе ня трэба хлапцоў... ды я-б ложак у канторку паставіў, ды і ў столь напляваў-бы.

Дырэктар фабрыкі тав. Плаўнік паведаміў нам:

— Створым камуны ў гэтым цэху, па кожным працэсе накшталт фрэзыроўшчыкаў і тады адмовімся ад цэхавай адміністрацыі. Пакінем аднаго загадчыка цэхам і... кропка.

Усе дваццацаць камунараў маюць на грудзях на камуне. На чырвонай драўлянай скрынцы вывешаны лічбы работы і сьпіс нагрузак. Асаблівую увагу заслугоўвае гэты сьпіс. Вось ён:

Па якасьці—Багданаў і Кузьмін.

Па зарплаце—Лук'ян.

Наведваньне кіно і тэатраў—Менсовіч і Шафран.

Сацыяльна-бытавыя пытаньні—Лунінскі і Голан.

Наведваньне сходаў і нарад—Мылаў.

Па ТДА-Авіяхэме і МОПР'ы—Мазурэнка-Сосін.

Па школах і ліквбезах—Фрыдлянд і Верабейчык.

Сьпісам не ахопіш усёй работы камунараў. Праўда, у каляндарным пляне работы камуны мы знаходзім пункты аб кадрах, аб рэгулярных нарадах, нават аб вылучэньні.

* * *

Мала зьмяніць адносіны да варштату, мала быць добрым вытворцам. Трэба быць і добрым грамадзянам працаўніком. У гэтым яшчэ розьніцы камунара ад рабочага-адасобніка, адсюль пачынаецца тое новае, што мы знаходзім у членаў камуны фрэзыроўшчыкаў.

Хто памятае рабочых Шафрана і Лук'яна да камуны, той мог сказаць аб іх толькі так:

— Слабыя хлопцы. Да іх і ня ўчуеш. Усё ў сябе. На сходзе маўчаць, нагрузак ня маюць, на вытворчасьці часта давалі дрэнную якасьць. Наогул пра іх дрэннага ня скажаш, ды і добрага сказаць нельга.

Камуна перакроіла Шафрана і Лук'яна. Шафрана і Лук'яна ўжо ставяць у прыклад нават унутры камуны.

У камуне пры арганізацыі было тры партыйцы.

Цяпер у партыі ўсе дваццацаць. Усе дваццацаць навучаюцца ў школах, усе дваццацаць маюць грамадзкія нагрузкі.

Гэтымі днямі на фабрыцы была з шумам распушчана іржэкамуна шнуроўшчыкаў. Адны толькі фрэзыроўшчыкі настойвалі на тым, што шнуроўшчыкі маюць усе даныя, каб стварыць сапраўдную камуну, што зіною роспуску зьяўляецца няўменьне арганізаваць.

— Бярэм яе на буксір,—парашылі фрэзыроўшчыкі.

Як дзецям фрэзыроўшчыкі на абяднаным паседжаньні паказалі навочна дзе корань зла.

— Таварышы, ды мы ня лепш за вас. З таго-ж мяса і не разумней за вас. Мы гаворым вам гэта ня з тэорыі, а з практыкі нашых будняў у камуне.

Фрэзыроўшчыкі пачулі прыліў гонару і энтузіязму, прыліў новай бадзёрасьці. Прачнулася да жыцьця захаваная недзе ў глыбіні натоеная энэргія. Гэта здараецца з людзьмі тады, калі яны пачынаюць бачыць плады сваёй работы.

Камуністычная праца здольна заклікаць да жыцьця, на новыя гэройствы людзей клясы, якой належыць гонар пабудовы сацыялізму. Чалавечы матар'ял перапляцецца тады ў новую, больш складаную і каштоўную форму.

Хочаце бачыць чалавечае перагартаваньне, хочаце бачыць як зьмяніліся людзі. Паглядзеце на камуну фрэзыроўшчыкаў. Новыя жаданьні, новыя імкненьні абуджаны ў дваццаці камунараў.

— Мала перабудаваць чалавека ў вытворчасьці, трэба перабудаваць быт.

Таму імкнецца да бытавой камуны фрэзыроўшчыкаў зразумелыя, законныя і ажыцьцяўлёныя.

У нас ёсьць усе даныя, каб прадбачыць у ліку першай бытавой камуны —дваццаць фрэзыроўшчыкаў з абутковай фабрыкі.

Б. Брадо

Другі этап культэстафэты

З бальшавіцкай напорыстасьцю змагацца за суцэльную пісьменнасьць

Апартуністы з Слуцкага, Ляднянскага раёнаў зрываюць ліквідацыю няпісьменнасьці

Браць за прыклад калектыў студэнтаў і настаўнікаў Полацкага пэдтэхнікуму, які па ўдарнаму змагаецца за ажыцьцяўленьне задач культурнай рэвалюцыі. Біцца за 100-процантнае выкананьне пляну ліквідацыі няпісьменнасьці

Па ударнаму ліквідаваць прарывы

Ул. І. Ленін у свой час сказаў—«Перамагчы народам няпісьменным, некультурным нельга». Адгэтуль ясна важнасьць тэй задачы, якая перад намі стаіць у галіне барацьбы за суцэльную праматнасьць.

Адзін з маршрутаў другога этапу культэстафэты ставіць задачай—бальшавіцкае змаганьне за 100-процантнае выкананьне пляну ліквідацыі няпісьменнасьці. Гэта задача можа быць выканана пры ўмовах, калі ў барацьбу за пісьменнасьць будуць уцягнуты шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-сераднацкія масы.

Матар'ялы, якія сёньня мы зьмяшчаем, сьведчаць аб тым, что ў радзе раёнаў не зразумелі ўсёй палітычнай важнасьці справы ліквідацыі няпісьменнасьці, што ў радзе раёнаў існуе праваапартуністычная практыка на гэтым баявым вучастку культурнай рэвалюцыі. Мы маем выпадкі, як у Случчыне, калі ў час культманэўраў узьнялі «шуміху», здавалася, усе пастаўлены на ногі, а як толькі справа падышла да практычнай барацьбы з прарывамі, дык мясцовыя арганізацыі і сам райштаб культэстафэты заснулі.

У Сьвіслацкім раёне мы маем яшчэ больш агідныя факты. Там адказныя працаўнікі РК ЛКСМБ запамятаўшы, што камсамол зьяўляецца шэфам усеагульнага навучаньня, заяўляюць, што культэстафэта лішняя цеганіна, што справа культбудаўніцтва камсамольскіх арганізацый не датычыцца. Такія разважаньні—ні што яшчэ, як самы махровы апартунізм на практыцы, па ім трэба біць па-бальшавіцку.

Сыгналізуючы аб прарывах на мясцох у справе ліквідацыі няпісьменнасьці, аб ігнараваньні некаторымі раённымі арганізацыямі дырэктыў XVI партзьезду ў галіне культурнай рэвалюцыі, мы патрабуем умяшаньня ў гэтую справу органаў КК-РСІ.

Разам з тым, мясцовыя партыйныя, камсомольскія, савецкія, прафсаюзныя і інш. грамадзкія арганізацыі павінны агульнымі сіламі ўзяцца за барацьбу з некультурнасьцю, з няпісьменнасьцю. Шырокія працоўныя масы павінны быць узьняты на самую бязьлітасную барацьбу са опадчыцкай царызму — няпісьменнасьцю. Трэба з бальшавіцкай напорыстасьцю ўзяцца за ажыцьцяўленьне заветаў У. І. Леніна—ліквідаваць няпісьменнасьць у нашай краіне.

Для гэтага «Мы павінны ўзяцца за простую пільную справу — мабілізацыю пісьменных для барацьбы з няпісьменнасьцю» (Ленін).

Неабходна шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў ліквпунктах. Ня толькі ліквпункт з ліквпунктам, сельсавет з сельсаветам, калгас з калгасам, раён з раёнам, але і самі няпісьменныя павінны быць уцягнуты ў сацспаборніцтва на хутчэйшую ліквідацыю няпісьменнасьці.

Адбарабанілі і... заснулі

Слуцак, (наш. кар.). З 1 красавіка да 1 ліпеня ў БССР праводзіцца другі этап культэстафэты.

Плян Слуцкага райштабу культэстафэты быў складзены, можна сказаць, досыць добра, але выкананьне яго... кепскае.

Калі культманэўры па горадзе прайшлі надворна з адпаведным «шумам і эфэктам», дык нутро іх аказалася зусім пустым. Прарыў у ліквідацыі няпісьменнасьці не ліквідаваны. Як і раней, замест 314 няпісьменных, наведваюць ліквпункт толькі 91 чалавек, як і раней настаўнікі прапускаюць заняткі, не зьяўляюцца на работу і як раней ніякія меры да іх ня прымаюцца.

Райпрафсавет пасьля «шуму» культманэўраў сьпіць неабудным сном. Нізавыя профячэйкі па прыкладу вышэйшага начальства таксама мірна пачываюць і патрабуюць моцнага штуршка, каб крыху ўзварушыцца.

А што робіць райштаб?

Ён вынес пастанову: «Даручыць тав...? (Нават невядома каму) высьвятліць прычыну ненаведваньня і... годзе.

Па вёсках становішча яшчэ горшае. Невядома што там робіцца? Ці выконваюцца дырэктывы райштабу, ці не, бо матар'ялы маюцца ўсяго ў двух сельсаветаў: з ЛЕНІНСКАГА і ЦАРАЎСКАГА.

Калі-ж добра азнаёміцца з вынікамі культманэўраў, ды і ў гэтых сельсаветах убачым, што ўсеагульнае навучаньне не праходзіла зусім нездавальняюча, а наведваньне ліквпунктаў ніколі не перавышала 50 проц.

Райштабу неабходна зараз-жа пераключыцца на сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы працы, праверыць работу ліквпунктаў і некаторых школ, а профсаюзным арганізацыям трэба ня толькі аказаць садзейнічаньне райштабу, але і самім актыўна ўключыцца ў культэстафэту. Неабходна шырэй папулярызаваць рашэньне XVI партзьезду ў галіне культурнай рэвалюцыі і ўзьняць працоўныя масы на ліквідацыю маючыхся прарываў.

А. КУРДО.

Ганебныя прарывы на Ляднянщчыне

трэба неадкладна ліквідаваць

Становішча з ліквідацыяй няпісьменнасьці па Ляднянскім раёне прымушае біць трывогу. Райвыканком, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі раёну на гэту справу не зьвяртаюць амаль ніякай увагі. **На раёне неахоплена ліквпунктамі звыш 800 чал. прадугледжаных плянам.**

Ня гледзячы на неаднаразовыя напамінкі і дапамогу з боку асьветнікаў, кіраўніцтва работай з боку палітасьветінспэктара адсутнічае. Разьязджаючы па раёне па розных заданьнях, ён ніколі не цікавіцца работай ліквпунктаў, якія амаль не працуюць. Тыя ліквпункты, якія «працуюць», наведваецца толькі па 3-10 чал., у той час, як па сьпісу лічыцца 40-50.

Ня лепш справа і з хатамі-чытальнямі. Загадчыкаў хат-чытальняў у Ляднянщчыне няма. **Усе хаты-чытальні за раз на замку.**

Грамадзкасьць вакол прарываў на фронце культбудаўніцтва не мабілізавана. **У раёне маецца думка, што гэтай работай павінны займацца толькі асьветнікі.**

Трэба раённым арганізацыям паўдарнаму ўключыцца ў правядзеньне другога этапу культэстафэты і мабілізаваць усе сілы, усю грамадзкасьць раёну на ліквідацыю прарываў.

Р.

Полацкі пэдтэхнікум паказвае ўзор, як трэба змагацца за культурную рэвалюцыю

Студэнты Полацкага пэдтэхнікуму разам з выкладчыкамі ўзялі культурнае шэфства над чатырма сельсаветамі раёну—Экіманскім, Верхачэнскім, Сосьніцкім і Салоніцкім. Работа шэфаў заключаецца: у шагалоўнай ліквідацыі няпісьменнасьці, у падшэфных с-с, у ажыцьцяўленьні палітэхнізацыі і іншых задач культурнай рэвалюцыі.

Для практычнага правядзеньня тэтай работы арганізаваны брыгады, паміж якімі заключаны дагаворы сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне шэфскай работы.

Якія-ж вынікі мы маем?

Па Экіманскім сельсавеце арганізаваны тры ліквпункты. Заняткі праводзяцца сіламі студэнтаў. Праведзены суботнік у камуне «Чырвоная Зорка». Па сельсавеце арганізавана 3 чырвоных куткі, двум з іх калектывам пэдтэхнікуму выпісаны газэты і часопісы. У адной школе арганізаваны гарачыя сьнеданьні, у дзьвюх школах арганізаваны рабочыя майстэрні і заключаны дагавор з камунай для правядзеньня палітэхнізацыі.

Па Сосьніцкім сельсавеце заключаны дагаворы па палітэхнізацыі паміж трыма школамі і калгасамі. Пры дзьвюх школах арганізаваны працоўныя куткі, адкрыты тры ліквпункты, якія абслугоўваюцца студэнтамі. Арганізавана 4 тэатратрады, двума з іх кіруюць студэнты. Пры 2-х школах арганізаваны гарачыя сьнеданьні, адкрыта 5 чырвоных куткоў.

Па Верхачэнскім і Салоніцкім сельсавеце арганізавана 6 чырвоных куткоў, з іх 4 пры калгасах. Усе дзеці школьнага ўзросту ахоплены школамі, 5 школ прымацаваны да калгасаў.

Па горадзе Полацку студэнтамі абслугоўваецца 7 ліквпунктаў, у якіх навучаецца звыш 200 чалавек.

У далейшым трэба ня спыняцца на дасягнутых посьпехах, а біцца за поўную ліквідацыю няпісьменнасьці, за палітэхнізацыю, за сапраўднае камунізтычнае выхаваньне падрастаючага пакаленьня. Усю работу трэба падначаліць барацьбе за пасьпяховае выкананьне задач другой бальшавіцкай вясны.

Ю. Росны.

Утвораны штаб не працаваў і не працуе

Па Харлапавецкім сельсавеце (Бабруйскі р-н) вельмі дрэнна абстаіць справа з культработай. Яшчэ з восені быў арганізаваны штаб культэстафэты. **Пачаўся другі этап культэстафэты, а штаб ніводнага разу не сабраўся на паседжаньне.** У вынику па сельсавеце адсутнічае культработа па вёсках і ў калгасах. Чырвоныя куткі ў вёсках і калгасах паразвальваліся, часьцей газэты не выдаюцца, дрэнна працуюць бібліятэкі. Клюб пры саўгасе «Жылічы» больш бызае на замку.

Інструктар па ліквідацыі няпісьменнасьці тав. Кучынскі бязьдзейнічае, аб ліквпунктах ён нічога ня ведае. Старшыня сельсавету тав. Саўчанка займаецца валакітай у выплаце ліквідатарам зарплаты. Дрэнна справа з палітэхнізацыяй школы. **Культустановы не мабілізаваны на пасьпяховае правядзеньне другой калгаснай вясны.**

Майсеенка С.

Багушэўскі і Уваравіцкі РВК не адказваюць на рабселькораўскія допісы

Некаторыя раённыя ўстановы на сыгналізацыю рабселькораўскіх допісаў не зьвяртаюць увагі. Пры расьсьледваньні допісаў яны абмяжоўваюцца бюракратычнымі адказамі, або зусім губяць допісы.

Прыкладам пераэгаваньня і бюракратычных адказаў на рабселькораўскія допісы могуць паслужыць Багушэўскі і Уваравіцкі РВК. Так, яшчэ ў 1930 г. рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» накіравала на расьсьледваньне Багушэўскаму РВК допіс «Трэба зьвярнуць увагу». Багушэўскія бюракраты замест расьсьледваньня гэтага допісу займаліся перасылкай яго прыватным асобам, нейкаму Акуленку, які зараз працуе ў Чарэйскай РСІ, як відаць з адказу РВК, гэты допіс Акуленкам згублены.

Уваравіцкі РВК у сваім адказе на допіс «Мясазагатоўкі сарваны» гаворыць, што сапраўды кулацка-заможная частка членаў сельсавету Арлов, Аванас, Лосев Архип, Лосев Сяргей і інш. на пленуме сельсавету выступалі супроць мясазагатовак, што на групы бедноты зьвярталася кулацка-заможная частка, якая крычала за арыў загатовак мяса і розных відаў загатовак. Гэтым Уваравіцкі РВК абмяжоўваўся, не ўказаўшы ў сваім адказе, якія прынятыя меры да гэтых кулакоў.

Бязумоўна, абмежаваньне такімі адказамі на рабселькораўскія допісы—ёсьць адна з праяў правага апартунізму на практыцы.

Ц. Ладуцька.

З лістоў рабселькораў

Кіно ў м. Бярэзіна (Бярэзінскі раён) вельмі часта жартуе з гледачамі: часам замест 6 частак даюць толькі 4—5, а рэшта недзе губляецца, часам фільм такі стары, што нічога не зразумеш. Бездзяржкіно павінна зьвярнуць на гэтыя недарэчнасьці ўвагу.

Руб—ны.

Амаль заўсёды на замку Камаровіцкая хата-чытальня (Петрыкаўскі раён). Газэты хоць і выпісваюцца, але да чытача не даходзяць—недзе губляюцца. Загадчык хаты-чытальні т. Бохан нішкай культмасавай работы не вядзе. Мясцовыя арганізацыі не зварочваюць на гэта ўвагі.

Інспэктар палітасьветы павінен прыняць меры да ажыўленьня работы хаты-чытальні.

Ул. Зоркі.

У вёсцы Раштова і некаторых іншых вёсках Махіраўскага сельсавету (Полацкі р-н) дагэтуль ліквпункты не працуюць. Наведваньне існуючых ліквпунктаў вельмі дрэннае. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі дагэтуль не зварочваюць увагі на справу ліквідацыі няпісьменнасьці.

М. Яроменка.

Надыходзіць веснавая сяўба, а ў Бельскай хаце-чытальні (Полацкі р-н) няма ніводнага лёзунгу, прысьвечанага гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Наогул, у хаце-чытальні адсутнічае культпраца, а сельсавет і парт'ячэйка не зварочваюць на гэта ўвагі.

Я—ка.

Абчугская ШКМ (Чарэйскі раён) прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Майстэрні школы ўжо адрамантавалі калгасам 5 барон і інш. інвэнтар. Вучнямі школы сабрана 7 цэнтнераў попелу.

Адамчук.

На працягу 8 месяцаў ніводнага разу ня была адчыненай Пагоцкая хата-чытальня (Бярэзінскі р-н). Набымі пазалетась за 600 руб. радыёпрыёмнік, але ён маўчыць.

Райінспэктар палітасьветы павінен урэшце накіраваць да нас загадчыка хаты-чытальні.

Свой.

Чырвоны куток калгасу «Колас» (Хойніцкі р-н) амаль не працуе. Выпісваюцца газэты, але яны ляжаць у шафе на замку. У лютым г. г. устанавілі пучнагаварыцель, ён крыху папрацаваў, а зараз маўчыць. Праўленьне калгасу павінна прыняць захады да таго, каб чырвоны куток запрацаваў

А. Вечар.

Даманавіцкі сельсавет (Мазырскі р-н) сыстэматычна затрымлівае выплату зарплаты настаўнікам. Старшыня сельсавету на гэта глядзіць скрозь пальцы і ня прымае мер да зьнічэньня гэткай ненармальнасьці.

Верас.

НАША КАНСУЛЬТАЦЫЯ да другой бальшавіцкай

Як праводзіць вапнаваньне глебы

Паход за павялічэньне ўраджайнасьці, зьяўляецца паходам за карэнную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Належнага павялічэньня ўраджайнасьці можна дабіцца толькі ў буйных сацыялістычных гаспадарках—саўгасах і калгасах, дзе можна выкарыстаць мэханізаваную апрацоўку зямлі, апраналічныя воды, ужываньне ўгнаеньня і г. д.

Вельмі вялікі ўплыў на падвышэньне ўраджайнасьці адыгрывае ўжываньне мясцовых відаў угнаеньняў, як торф, фасфарыт, вапна. Ужываньня гэтых відаў угнаеньня можна дабіцца ў шырокіх разьмерах у сацыялістычных гаспадарках — калгасах і саўгасах.

У гэтым артыкуле мы спынімся на тым, як ужываць вапну на ўгнаеньне. Ва ўмовах БССР вапны на ўгнаеньне хапае ў неабмежаванай колькасьці. На 1931 г. урад БССР намеціў заваппаваць 60 тысяч га, з якіх у саўгасах 10 тысяч га, калгасах—40 тысяч га і вытворчых таварыствах—10 тысяч га.

Чаму трэба вапнаваць глебу

Вядома, што па БССР распаўсюджаны падзолістыя глебы, у якіх вапна з ворнага слою ў большасьці вымыта. Глебы, у якіх не хапае вапны, маюць шмат шкодных для расьлін кіслот, пры апрацоўцы іх пыляцца, лёпка спльваюцца, цьвярдзеюць і пасьля дажджоў пакрываюцца скарынкай. Мінэральныя ўгнаеньні, гной, торф, лубін і інш., на такіх глебах дзейнічаюць менш на падвышэньне ўраджайнасьці. Праведзеныя на працягу 2-х год дасьледваньні глеб па кіслотнасьці дасьледчымі станцыямі і цэнтральнай аграхімічнай лябараторыяй паказалі, што больш 90 проц. усіх глеб БССР патрабуюць вапнаваньня. Для палепшаньня такіх глеб патрэбна ўнасіць вапнявую, крэйдавую, муку і мергілі, якія зьніжаюць паказаныя недахопы.

Галоўная карысьць ад вапны тая, што яна:

1) утварае дробна-пруткаватую будову глебы. Ад вапнаваньня глеба робіцца больш пульхнаю, лепш прапускае паветра, не дае скарынкі і лягчэй апрацоўваецца;

2) зьнішчае і памяншае кіслотнасьць на падзолавых глебах, ліпкі якой шкодны для многіх расьлін;

3) павялічвае ўплыў і карысьць ад ужываньня мінэральных угнаеньняў;

4) дапамагае хутчэйшаму раскладу арганічных угнаеньняў (гной, лубін, торф і інш.);

5) захоўвае раскладзеныя часткі арганічных угнаеньняў у глебе ад вымываньня;

6) узмацняе дзейнасьць карысных бактэрый у глебе;

7) зьнішчае некаторыя крыбныя хваробы расьлін (капустная кіла).

Лепш за ўсё уносіць вапну: 1) пад віка—аўсяную мешанку у занятым папары; 2) пад жыта, пшаніцу, ячмень і авёс з падсевам канюшыны, якая знач на дае прыбаўкі ўраджаю пасьля вапнаваньня глебы; 3) пад зярнёвыя—бабовыя: гарох, фасоль і бабы; 4) корнеплоды.

Вапну нельга ўносіць непасрэдна пад пасевы лёну, канапель, бо атрымліваецца валакно дрэннай якасьці, пад бульбу, бо яна тады больш хварэе рознымі прыбнымі хваробамі, пад лубін і сэрадэлю. Таму ў севазвароце вапну трэба ўносіць з такім разьлікам, каб вышэйпералічныя культуры пападалі на заваппаваныя палі праз 2-6 гадоў пасьля вапнаваньня.

Колькі патрэбна ўносіць вапны на га

Пасьля вызначэньня аграномам кіслотнасьці, высьветляецца колькі патрэбна класьці вапны на га. Патрэбу ў вапне таго ці іншага поля, сенажаці магчыма вызначыць непасрэдна ў полі простымі прыладамі (універсальным індыкатарам). Ня гледзячы на тое, што ўсе раёны гэтымі прыладамі забясьпечаны, яны райагранрацаўнікамі ў большасьці не скарыстоўваюцца. Ёсьць такія раёны, у якіх маецца па 5-6 індыкатараў і стаяць у працягу 1-2 гадоў у шафе без ужываньня (Клімавіцкі, Крычаўскі раёны).

Па матар'ялах дасьледчых станцый рэйца арыентоўна ўнасіць на 1 га:

На лёгкіх пясчаных і супясчаных глебах—2-3 тоны,

на лёгкіх суглінках—3-4 тоны,

на сярэдніх суглінках—4-5 тон,

на цяжкіх глінстых—5-8 тон.

Такую-ж колькасьць можна ўжываць крэйдавых адкідаў Добрушскай папяровай фабрыкі. Мергіль, які ёсьць у шмат раёнах БССР магчыма ўжываць у 1,5—2 разы больш, гледзячы ад процанту вапны. Мергіль трэба ўжываць пасьля 2-х і больш месяцаў яго здабычы, калі ён ад марозаў, дажджоў і паветра рассыпіцца ў парашок.

Калі ўносіць вапну

Размолатая вапна і крэйда дзейнічае ў глебе павольна, а таму лепш вапнаваць глебу за некалькі месяцаў да сяўбы. Пад азімыя культуры трэба вапну ўносіць перад першым ворывам альбо пры занятым папару пад віка-авёс—з восені. Пад яравыя культуры лепш за ўсё ўносіць з восені пры зяблевым ворыве. У выпадку спазьненьня, вапну можна ўносіць пад яравыя пасевы вясною пад першую апрацоўку глебы, але ня менш за 2 тыдні да сяўбы.

З якімі ўгнаеньнямі і як трэба ўносіць вапну

Вапну раскідаюць па полі спэцыяльнымі вапнянымі сяўлікамі, якія тэта вясной завозяцца, альбо тукавікамі з расьсеве мінэральных угнаеньняў. Некаторыя калгасы ў мінулым годзе жадзелі расьсеў вапны непасрэдна з вазоў лапатамі (калгасы Аршанскага раёну), дзеля чаго патрэбна вызначыць колькасьць вапны на га расьсеяць раўнамерна. Засыпку вапны трэба праводзіць на глыбіні пахатнага пласту. Калі на поле ўносіцца гной, дык вапну трэба ўносіць уперад і толькі ў выпадку ўнясеньня іх разам, трэба пасыпяшаца з засыпкай (уперад расьсыпаць вапну, а потым пакласьці гной і заараць).

Перад унясеньнем яе трэба вапну зьмешваць з суперфасфатам, сульфатам амоніяк ды іншымі кіслымі ўгнаеньнямі. У такіх выпадках патрэбна ўперад уносіць вапну, а потым праз 2 тыні магчыма ўжо ўносіць гэтыя кіслы ўгнаеньні. Уносіць фасфарыт і каслоцную муку трэба за адзін-два гады да вапнаваньня глебы.

Што дае вапнаваньне глебы

Досьледы з вапнай паказалі вялікую карысьць ад вапнаваньня глебы. Паволле дадзеных дасьледчых станцый, на суглінках і супесях ад вапнаваньня глебы мажліва атрымаць над вышэйшае ўраджайнасьці па зярнёвых—на 15 проц., бабовых і канюшыне—на 25 проц. у адзін год. Вапна дзейнічае ў працягу 8 гадоў і кожны год атрымліваюцца прыбаўкі ўраджаю. Унесеныя 3-4 тоны вапны на 1 га коштам 11—15 руб. адзін раз на працягу 5—8 гадоў даюць прыбаўкі ва ўраджаях на 90 руб. агульнага прыбытку.

Поўная мабілізацыя ўсіх сіл, сродкаў і асабліва зацікаўленасьць з боку саўгасаў, калгасаў па выкананьні вызначаных заданьняў па вапнаваньні глебы—даюць усе мажлівасьці правесьці гэтае мерапрыемства своячасова, што ў сваю чаргу забясьпечыць над вышэйшае ўраджайнасьці кашых падзолістых глеб. Вялікую ролю ў правядзеньні гэтага мерапрыемства павінны адыграць ячэйкі АСО ў вёсцы, і таксама камсамольскія і іншыя арганізацыі, якія павінны быць першым застрэльшчыкамі па правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў, зьвязаных з хімізацыяй сельскай гаспадаркі і падвышэньнем ураджайнасьці.

Кесараў.

Зрушыць справу з мёртвага пункту

Работа па арганізацыі і разгортваньні работы дэпутацкіх груп на прадпрыемствах да гэтага часу не кранулася з мёртвага пункту. Сацыялістычнае спаборніцтва, на якое вышаў Бабруйскі гарадзкі савет у пытаньні разгортваньня работы дэпутацкіх груп—разгортваньня практычнай работы па сацыялістычнай сумлячальнасьці застаецца і да гэты час толькі добрым пажаданьнем не ператвораным у жыцьцё.

Гарадзкі савет ня кіруе імі, бо сам лічыць, што да таго часу, пакуль ня будуць арганізаваны ўсе групы—з гэтай невялікай колькасьцю разгортваць работу ня варта.

Гарсавет паслаў лісты ў Харкаў, Гомель, Магілёў і іншыя гарады, з просьбаю падзяліцца вопытам работы, але дагэтуль адказу на лісты няма і бабруйскія гарсаветчыкі сядзяць і чакаюць.

Аб нябыцьці ўласнага вопыту, аб разгортваньні самакрытыкі работы яны ня думаюць.

На астатніх прадпрыемствах Бабруйску арганізацыя дэпутацкіх груп бясконца зацягваецца. Нізавыя прафсаюзныя арганізацыі і райпрафсавет літаральна не дапамагаюць гарадзкому савету.

На абавязку фабзаўкомаў ляжала вылучыць для работы ў гарсавеце 400 актывістаў прадпрыемстваў, вылучана-ж толькі 100. Камсамольскія арганізацыі ў сваю чаргу недапушчалі на лядбайна адносіліся да ўдзелу ў рабоце гарсавету. Замест таго, каб даць звыш 100 камсамольцаў для ўдзелу ў рабоце сэкцый гарсавету камсамол вылучыў усяго толькі... 5 асоб.

Гэтая апартуністычная недаацэнка ролі дэпутацкіх груп на прадпрыемствах зьяўляецца асноўнай прычынай зрыву ўсяе работы.

Неабходна абвясьціць бязьлітасную барацьбу недаацэнцы палітычнай ролі работы дэпутацкіх груп, якую праяўляюць бабруйскія арганізацыі.

Брыгада «Сав. Бел.»: А. Дамброўскі, П. Герчыкаў, К. Кушняроў.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Дом Асьветы.—Сёньня 11-IV г. г. а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульна-гарадзкі зьлёт асьветнікаў-ударнікаў.

На абвестцы дню: 1) Аб конкурсе на лепшую культасьветустанову.

2) Аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой пасеўкампаніі.

Дом Асьветы.—Заўтра 12-IV г. г. а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульна-гарадзкая канфэрэнцыя Саюзу Працасьветы.

На абвестцы дню: 1. Чарговыя задачы профработы ў адпаведнасьці з пастановамі V пленуму УсеЦСПС.

2. Выбары дэлегатаў на міжсаюзную агульна-гарадзкую канфэрэнцыю.

Фракцыя канфэрэнцыі а 5-й гадз дню 12-IV г. г. там-жа.

Усіх членаў Сэкцыі Навуковых працаўнікоў, якія вярнуліся з пасеўнай кампаніі, Ц. Б. просіць напісаць падрабязна рапарт аб праробленай ім працы на пасеўнай кампаніі і здаць у Ц. Б.

Беларуская Дзяржаўная Студыя спэры і балету абвяшчае, што 12 красавіка 1931 г., а 12 гадзіне ўдзень у памяшканьні Белдзяржмузтэхнікуму, пакой № 20 адбудзецца чытка лібрэтто новай арыгінальнай Беларускай опэры «Сталінтан» аўтараў т.т. Ладнага і Брадоцкага.

Запрашаюцца т.т. Канакоцін (ЦК КП(б)Б), Гурскі, Шамшур, Любан, Гарбуз (НКАсьветы), Куліненка (Гаркам КП(б)Б), Гурэцкі, Марголін (ЦП саюзу Працмастацтва), Лімаеўскі, Александровіч (БелАПП), Вольскі (БДТ), Клімковіч, Кац (ЦСПСБ), Булзінскі (рэд. «Зьвязда»), Шастакоў рэд. «Савецкая Беларусь»), Красіна і Дайн (рэд. «Рабочий»), Платаў (рэд. «Чырвоная Зьмена»), Рацэвіч (ЦК ЛКСМБ), Казакоў (Музтэхнікум), Стэльмах (Белтрам), Лебедзеў (Яўтрам).

Дырэкцыя Белдзяржстудыі опэры і балету.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Вайсковая кніжка на імя Дварэка А. Л., нарадж. 1901 г., кв. 98.

Вучотная картка на каня на імя Пятаса Д. К., кв. 99.

Вайсковая кніжка № 744, на імя Чарнагаловага А. К., нар. 1892 г., кв. 108.

Вайсковы білет № 151 на імя Макарэвіча Г. В., выд. Жыткаўскім Ваенкаматам, нар. 1904 г., кв. 109.

Вайсковы білет № 2097 на імя Салепа В. Ф., выд. Жыткавіцкім Ваенкаматам, нар. 1904 г., кв. 110.

Вайсковы білет на імя Баньдука А. С., выд. Жыткавіцкім ваенкаматам нар. 1905 г., кв. 111.

Вайсковы білет на імя Пархоменка Ф. В., нар. 1903 г., кв. 112-п.

Вучотна-вайсковая кніжка на імя Цаленчука А., кв. 113-п.

Бестэрміновае асабістае пасьведчаньне на імя Міхліна М. Е., выд. Мсьціслаўскім адрасн. сталом 29-XI 1929 г., № 1636, кв. 114-п.

Вайсковы білет на імя Саўчыца Г. І. выд. Жыткавіцкім Ваенкаматам, нар. 1906 году, кв. 115-п.

Вайсковы білет на імя Мартынава С., выд. Журавіцкім ваенкам. у 1924 г., кв. 116-п.

Сяброўскі білет № 43-8039; вайсковы білет і мэтрычны выпіс; камсамольскі білет на імя Маслакова І. П., кв. 117-п.

Квіт аб уплаце 15 р. авансу Турэўскаму спаж. т-ву на імя Русало С. В., кв. 118-п.

Асабістая вайсковая кніжка на імя Страпчэнка П., выд. Мялчыцкім ваенкаматам, кв. 119-п.

Вайсковая кніжка на імя Цурганава Л. Л., выд. Мсьціслаўскім ваенкаматам, кв. 120-п.

Вайсковая кніжка на імя Леднева П. Е., выд. Мсьціслаўскім ваенкаматам кв. 121-п.

Вайсковая кніжка на імя Мізіркава С. С., выд. Мяляцкім ваенкаматам, кв. 122-п.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 6-га КРАСАВІКА

Кіно-тэатр „Культура“	УГУБЗІАРА Хроніка Саюзкіно № 12. Пач.: 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса—з 5 гадз.
„Чырвоная Зорка“	Новы савецкі фільм ГОСЬЦЬ З МЭКІ Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	У лепш. комэд. Монці Бэнкс ЛЁТАЮЧАЕ ШЧАСЬЦЕ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	2-гі тыдзень АБРЭК ЗАУР Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

Даводзіцца да ведама ўсіх установаў і прадпрыемстваў гораду Менску,

ШТО

ПАТРАБАВАНЬНІ НА РАБСІЛУ

ПРАВОДЗЯЦЦА ВЫКЛЮЧНА ПА ЎСТАНОЎЛЕНАЙ ФОРМЕ.

Парадак патрабаваньня ёсьць у самых бляшках.

Бляшкі патрабаваньня неабходна атрымаць у кіраўніцтве кадраў, г. Менску (рог Леніскай і Унівэрсытэцкай, № 26-31).

Усялякія патрабаваньні не па форме выконвацца ня будуць.

МЕНСКІ Дзяржаўны Архітэктурна-Будаўнічы Тэхнікум АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1-шы КУРС ТЭХНІКУМУ.

— Прынята будзе 40 асоб. —

Прыём заяў з 15 па 25 красавіка г.г. штодзённа ў канцэлярыі Тэхнікуму (Менск, вул. Карла Марса, д. № 37) з 9 да 4-х гадзін.

Пачатак заняткаў 5-га мая г. г.

Правілы прыёму ў даведчыку НКА, выдадзеным у мінулым годзе.

Галоўлітбел № 598.

МЕНСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ

— АБВЯШЧАЕ, —

што згодна пастановы СНК СССР, усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, а таксама і кааперацыйныя арганізацыі павінны да 13-га красавіка г. г.

АБМЕНЯЦЬ У ДЗЯРЖБАНКУ НАЛЕЖАЧЫЯ ІМ АБЛІГАЦЫІ

—дзяржаўных выйгрышных пазык—

НА АБЛІГАЦЫІ 4-ай ДЗЯРЖАЎНАЙ УНУТРАНАЙ 8% ПАЗЫКІ 1928 г.

Паколькі некаторыя дзяржустановы такога абмену яшчэ ня вытварылі, Гарфа прапануе безадкладна вытварыць гэты абмен.

ГАРФА

З 1-га чэрвеня г. г.

— пры —

ЎСЕБЕЛАРУСКІМ ПАЛІТЫКА-АСЬВЕТНЫМ ТЭХНІКУМЕ

(Магілёў н-Д., Комсамольская, 28)

АДЧЫНЯЮЦЦА ЧАТЫРОХМЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ

па падрыхтоўцы ў гэты тэхнікум

На курсы прымаюцца з ведамі 4-5 груп самігодкі і ў астатнім кіравацца правіламі прыёму у тэхнікум на 1931-32 г.

Усе райкомы партыі пасылаюць на курсы па два курсанты.

Прыем камандыровак з дакумантамі адбываецца да 15 мая.

Дырэктар П. КАПАЕВ.Ч

АД БЕЛКАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКУ

Пачынаючы з 11-га красавіка штодзённа ў памяшканьні Менскага гарадзкога аддзяленьня дзяржбанку ў пакоі крэдытна-плянавага аддзелу (1 паверх) ад 9 гадзін да 12 гадз. дня і ад 8 гадз. увечары

БУДЗЕ ДАВАЦЦА КАНСУЛЬТАЦЫЯ

ПА ПЫТАНЬНЯХ ЗЬВЯЗАНЫХ З ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ЗАКОНАЎ АД 14-І і 20-III—31 г. АБ ЗЬМЕНАХ У СЫСТЭМЕ КРЭДЫТАВАНЬНЯ.

№ тэлефону дзяжурнага кансультанта—13-56.

ЗДАВАЙЦЕ ПАДПІСКУ НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

Орган ЦВК і СНК БССР

ТОЛЬКІ НА ПОШЦЕ.

ЗГУБЛЕНЫ:

Паявая кніжка № 7834-2928 на імя Бэрман С. М., выд. Калінкавіцкім райспажыўтаварыствам, кв. 83.

Вайсковая кніжка на імя Іванова Р. М., выд. Мазырскім Акрваенкаматам за № 28, кв. 84.

Чырвонаармейскі білет на імя Сяцко Ю., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, № 85.

Паявая кніжка № 857 з паявымі ўзносамі на 14 р., на імя Фурмана, кв. 87.

Паявая кніжка на імя Вараб'я, выд. Чэрвенскім спаж. каап., кв. 86.

Вайсковая вучотная картка на імя гр. Сінцкага В. А., жых. в. Кахімірукі, Засінцаўскага с.-с., Каралінскага раёну, кв. 90.

Паявая кніжка на імя Маргуцеца І. Ф., выд. Нараўлянскім спаж. т-вам, кв. 91.

Вайсковая кніжка № 124 на імя Кізьляка П. Ф., кв. 92.

Вайсковая кніжка № 972 на імя Новіка А., выд. Азарыцкім РВК.

Вайсковая кніжка № 1371 на імя Пунтуса Ф. С., нарадж. 1896 г., кв. 95.

Вайсковая кніжка на імя Паравога Л. І., кв. 96.

Вайсковая кніжка на імя Баранічка П. С., кв. 97.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.